*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
СУБОТА
№ 188
(26301)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Заробкі

## На 17 працэнтаў БОЛЬШ ЗА ІНФЛЯЦЫЮ

**У канцы наступнага года сярэдняя зарплата па Беларусі павінна складаць 550 долараў у эквіваленце — аб гэтым паведаміў міністр працы і сацыяльнай абароны Уладзімір Патупчык.**

### Бюджэтная прыбаўка — з лістапада

**Наступнае павышэнне бюджэтнай тарыфнай стаўкі І разраду павінна адбыцца з 1 лістапада. Яна павысіцца з 73 да 91 тысячы рублёў,** што ў цэлым забяспечыць рост сярэдняй зарплаты невытворцаў на 21 працэнт. Пры гэтым адначасова са змяненнем тарыфнай стаўкі І разраду ў лістападзе мяркуецца ўвядзенне каэфіцыентаў. «Тарыфная сетка складаецца з 27 разрадаў, і плануецца, што да 1—12 разрадаў будуць вызначаны павышаючыя, а для астатніх больш высокіх разрадаў — паніжаючыя каэфіцыенты, — заўважыў Уладзімір Патупчык. — Падобнае «пашырэнне» і «сцісканне» тарыфнай сеткі робіцца для таго, каб пазбегнуць занадта вялікай розніцы ў павелічэнні заробкаў у абсалютных лічбах. Мы лічым такі падыход правільным і маем намер практыкаваць яго надалей».

Адначасова, паводле слоў міністра, у бюджэт 2009 года закладзены дастаткова высокія паказчыкі росту заробкаў. Чакаецца, што налета рэальная, з улікам змянення цэнаў на тавары і паслугі, сярэдняя зарплата павысіцца на 17 працэнтаў. Гэта самыя значныя тэмпы росту за апошні час. У прыватнасці, у снежні наступнага года агульная зарплата па краіне выйдзе на адзнаку 550 долараў.

Што ж да бліжэйшай перспектывы, то ўжо з 1 студзеня наступнага года ў сярэднім на чвэрць павінны ўзрасці заробкі педагагічных работнікаў. Адпаведнае рашэнне ўжо падрыхтавана і накіравана на разгляд у Савет Міністраў. «Гэту прыбаўку работнікі адукацыі павінны атрымаць плюс да павышэння тарыфнай стаўкі І разраду ў лістападзе», — падкрэсліў міністр.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

## Аляксандр Лукашэнка спадзяецца, што актыўныя намаганні Беларусі па ўстанаўленні партнёрства з ЕС атрымаюць падтрымку ў Берліне

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Федэральнага Прэзідэнта Федэратыўнай Рэспублікі Германія Хорста Келера з нацыянальным святам — Днём германскага адзінства.**

«Спадзяюся, што актыўныя намаганні Беларусі па ўстанаўленні ўсебаковага партнёрства з нашым суседам — Еўрапейскім саюзам, адным з безумоўных лідараў якога з'яўляецца Германія, атрымаюць належную ацэнку і падтрымку ў Берліне», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў перакананасць, што канструктыўны дыялог паміж дзвюма краінамі будзе садзейнічаць умацаванню беларуска-германскага супрацоўніцтва ва ўсіх галінах.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Дзяржпрадпрыемствы павінны выкарыстоўваць вопыт прыватнікаў

Прадпрыемствы дзяржаўнага сектара павінны актыўна пераймаць станоўчы вопыт кіравання прадпрыемствамі, які дэманструецца ў прыватным сектары эканомікі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы шклозаводы Гомельскай вобласці.

«Сёння наспела сітуацыя, калі мы можам свабодна пусціць прыватнікаў у прамысловасць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы будзем параўноўваць работу дзяржаўных прадпрыемстваў і прыватных і рабіць з гэтага адпаведныя вывады».

Прэзідэнт Беларусі станоўча ацаніў работу сумеснага беларуска-аўстрыйскага прадпрыемства «Гомельскі шклатарны завод». «Давайце развіваць сыравінную базу, якая дасць магчымасць нам пераадолець залежнасць ад імпарту дарагой сыравіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Калі мы бачым, што пяску, прыдатнага для вытворчасці шкла, у тым або іншым радовішчы недастаткова, мы павінны шукаць іншыя месцы ў Беларусі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым ён дадаў, што можна адкрываць паралельныя вытворчасці сыравіны для шклозаводаў.

Прэзідэнт адзначыў існуючыя праблемы па няхватцы кальцыніраванай соды. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што падыходзячыя прадпрыемствы ў гэтым плане можа арганізаваць аўстрыйская кампанія АТЕС. «АТЕС добра зарэкамендаваў сябе, за 6 гадоў ён уклаў у беларускую эканоміку $100 млн», — растлумачыў Прэзідэнт.

«Да 7 лістапада 2010 года Праграма развіцця шкляной прамысловасці павінна быць поўнасцю выканана, каб можна было ўбачыць адпаведнасць прадукцыі еўрапейскім і сусветным нарматывам», — падкрэсліў Прэзідэнт. Прыклады таго ёсць: завод «Ялізава» і Гомельскі шклатарны завод, — дадаў ён.

Прэзідэнт даручыў звярнуць асаблівую ўвагу на крытэрый энергаёмістасці, а таксама на экалагічную бяспеку. «Абодва гэтыя параметры павінны выконвацца так, каб адпавядаць еўрапейскаму ўзроўню», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўрад павінен вельмі строга падыходзіць да расходаў сродкаў. «Асноўны цяжар існуючых сродкаў трэба інвеставаць у вытворчасць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Сітуацыя ў свеце складваецца так, што існуючыя сродкі трэба ў кароткія тэрміны ўкласці ў тыя праекты развіцця прамысловасці, якія ўжо ёсць, прадуманы і не тояць у сабе сур'ёзнай рызыкі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Звычайна ўрад прад'яўляе прэтэнзіі да кіраўнікоў прадпрыемстваў і гаворыць аб няхватцы праектаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але вытворцы інфармуюць мяне аб тым, што ўжо ёсць гатовыя праекты, прадумана мадэрнізацыя, аднак на асобныя этапы не хапае інвестыцый. Дык чаму б не інвеставаць сродкі ў далейшае развіццё гэтых прадпрыемстваў». Пры гэтым кіраўнік дзяржавы сказаў, што на гэта адпушчана 2-3 гады.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання шклозаводаў Гомельскай вобласці даў даручэнне дасягнуць еўрапейскіх стандартаў у прадукцыі айчынных шклозаводаў да канца 2010 года.

Кіраўнік дзяржавы таксама запатрабаваў завяршыць тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемства «Гомельшкло» да 7 лістапада 2010 года і прывесці ў парадак існуючыя тэрыторыі і плошчы.

Кіраўнік дзяржавы даручыў ураду і КДК разгледзець пытанне аб дадатковым выдзяленні на мадэрнізацыю «Гомельшкло» 150 млн еўра.

«Часта мы шукаем новыя праекты, вельмі пры гэтым рызыкуючы. А тут рызыка мінімальная, — адзначыў Прэзідэнт. — Лепш гэты праект падштурхнуць, чым шукаць якія-небудзь новыя, не даследаваныя».

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Адзін з самых маладых школьных дырэктараў Віцебшчыны Вольга Бародзіч гэтак і кажа: «Школа — адна каманда». Згадзіцеся, гучыць вельмі па-сучаснаму. Але насамрэч Зялёнкаўская сярэдняя школа Полацкага раёна, у якой працуе 21 настаўнік і навучаецца 104 вучні, — сучасны зладжаны калектыў, які не мінаюць поспехі і ўзнагароды. Штогод больш за палову выпускнікоў гэтай установы паступаюць у прэстыжныя ВНУ краіны, рэдкія выпускі без медалістаў. Магчыма, Вользе проста пашанцавала з калектывам, магчыма — школе з кіраўніком.*

*Але крыху пра здымак, які быў зроблены на восеньскім свяце вёскі Зялёнка. Школьнікі таксама ўдзельнічалі ў спартыўных гульнях, і дырэктар **Вольга БАРОДЗІЧ** сваім эмацыянальным станам падтрымлівала вучняў, як капітан ці трэнер падтрымлівае сваю каманду.*

*Вольга з настаўніцкай дынастыі — бацька і дзед таксама прысвяцілі сябе прафесіі «сеяць разумнае, добрае, вечнае». Скончыла Віцебскі педагагічны ўніверсітэт і вярнулася ў родную школу настаўнікам беларускай мовы і літаратуры і гісторыі. Класны кіраўнік, завуч, дырэктар — усе прыступкі школьнай ерархіі — гэта яе прафесійная сталасць. Між іншым шосты год Вольга Бародзіч з'яўляецца кіраўніком адукацыйнай установы і менавіта пад яе кіраўніцтвам Зялёнкаўская школа станавілася лепшай у вобласці па добраўпарадкаванні, арганізацыі вучэбнага працэсу і навучанні дзяцей народным промыслам і дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам. «Мы імкнёмся выхаваць сапраўдных гаспадароў — на зямлі і ў доме», — кажа дырэктар. Сама ж яна для прафесійнай дасканаласці атрымала яшчэ адну адукацыю, скончыўшы Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. На пытанне пра ўласныя поспехі, не задумваючыся, адказала, што чатыры вучні з яе першага выпуску таксама выбралі прафесію настаўніка. І гэта для яе гонар.*

## Казімір ФАРЫНО: «ПРОСТА ЛЮБІЦЬ ДЗЯЦЕЙ — НЕДАСТАТКОВА»

Работа над Нацыянальным педагагічным энцыклапедычным слоўнікам вядзецца цяпер у Беларусі. Нечакана самай вялікай праблемай пры яго стварэнні аказаўся падбор тэрмінаў. Высветлілася, што ёсць вельмі шмат паняццяў, якія педагогі лічаць сваімі, напрыклад, каханне, дабрыня, цярплівасць, бескарыслівасць, перспектыва. Для педагогаў — гэта крэда іх прафесійнай дзейнасці.

— Менавіта ад асобы настаўніка залежыць вельмі і вельмі многае: наколькі камфортна будзе дзіцяці ў школе, ці выйдзе са школы чалавек са сфарміраванай маральнай і грамадзянскай пазіцыяй, ці пранясе ён жаданне навучацца праз усё сваё жыццё, — такую думку на прэс-канферэнцыі, прысвечанай прафесійнаму святу педагогаў, выказаў **намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір ФАРЫНО.** — Настаўнік павінен быць сам пастаянна адкрыты і да новых ведаў, і да патрэбаў вучня. А проста любіць дзяцей, прабачце, недастаткова.

Сёння вышэйшую адукацыю маюць 88,9 працэнта педагогаў. Вышэйшую і першую кваліфікацыйныя катэгорыі — 68,3 працэнта. Штогод праз сістэму паслядыпломнай адукацыі праходзяць больш як 60 тысяч чалавек, або кожны трэці педагог. Падлічана, што пачынаючы з першага конкурсу «Настаўнік года», г.зн. з 1991 года, праз яго розныя этапы прайшлі каля 12 тысяч чалавек.

Сёлета ў лістападзе стартуе першы этап рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года-2009» (згодна з Палажэннем, конкурс праводзіцца не радзей чым раз у тры гады). Спачатку пройдуць конкурсы на рэгіянальным узроўні. Галоўны ж прыз лепшаму беларускаму настаўніку па традыцыі ўручыць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Па словах Казіміра Фарыно, за даволі кароткі час дзякуючы вялізнай рабоце і Нацыянальнага інстытута адукацыі, і Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, а таксама лепшых беларускіх педагогаў былі створаны ўсе ўмовы для пераходу беларускай школы на 11-годку. З удзелам прадстаўнікоў Бюро Навукова-метадычнага савета пры Мінадукацыі, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, Нацыянальнай акадэміі навук і Саюза пісьменнікаў Беларусі былі перагледжаныя і скарэктаваныя вучэбныя праграмы: падрыхтавана 31 вучэбная праграма, у тым ліку 24 праграмы для 5—11-х класаў. У іх распрацоўцы ўзялі ўдзел таксама 64 прадстаўнікі ВНУ.

— Я хачу запэўніць, што падручнікаў для 6-х, 7-х і 8-х класаў было выпушчана раней на 15 працэнтаў больш, чым мы маем на сёння вучняў, — запэўніў Казімір Фарыно. — Таму новыя падручнікі друкаваць не мае ніякага сэнсу — трэба толькі пераразмеркаваць тое, што ўжо было выпушчана раней і знаходзіцца ў школьных бібліятэчных фондах. Але гэты працэс праходзіць няпроста. Адзінае, што нас непакоіць, гэта праблема забеспячэння падручнікамі вучняў 9-х і 11-х штрых-класаў у другім паўгоддзі. Варыянт вырашэння гэтай сітуацыі — электронныя версіі падручнікаў, якія мы размясцілі на сайтах Міністэрства адукацыі, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Нацыянальнага інстытута адукацыі. У кожнай школы ёсць выхад у інтэрнэт. У Мінску 60 працэнтаў сем'яў, у якіх выхоўваюцца школьнікі, таксама маюць дома камп'ютары. Забеспячэнне вучэбнага працэсу падручнікамі — персанальны абавязак дырэктара школы...

Казімір Фарыно запэўніў, што інтарэсы вучняў штрых-класаў, якія навучаюцца па пераходных вучэбных праграмах, не пацерпяць ні пры правядзенні школьных прадметных алімпіяд, ні пры здачы выпускных экзаменаў, ні пры паступленні... Праграмы ўступных іспытаў і выпускных экзаменаў будуць ствараццa на «скрыжаванні» дзвюх вучэбных праграм (для 9, 11, 9' і 11' класаў), каб усе вучні знаходзіліся ў роўных умовах. А на школьных алімпіядах больш важна нават не веданне школьнай праграмы, а агульнае інтэлектуальнае развіццё вучня, яго нестандартнае мысленне.

Наконт працоўных водпускаў педагогаў Казімір Фарыно паведаміў наступнае: «Мы ўнеслі ўжо больш як дзесяць сваіх прапаноў у Міністэрства фінансаў і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Аднак мы не збіраемся супакойвацца. Будзем працаваць у гэтым накірунку і далей».

Варта нагадаць, што з 1 студзеня 2009 года тарыфныя аклады школьных педагогаў узрастуць на 25 працэнтаў. Маладыя педагогі будуць атрымліваць штомесячныя даплаты ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду. Будуць устаноўлены надбаўкі за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі педагагічнага работніка кіраўнікам навучальных устаноў і іх намеснікам па асноўнай дзейнасці. Праграмай развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі на 2009—2014 гады прадугледжана павелічэнне памераў заработнай платы таксама і работнікам дашкольных устаноў. І толькі педагогаў пазашкольных устаноў пакуль не абнадзеілі доўгачаканым паведамленнем аб павышэнні ім заработнай платы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Садзейнічаць росквіту сваёй дзяржавы

*Дарагія сябры! Паважаныя калегі!*

*Сардэчна віншую вас з прафесійным святам — Днём настаўніка і выказваю шчырую ўдзячнасць за вашу карпатлівую, высакародную працу.*

*Мне вельмі хочацца павіншаваць усіх, хто ўносіць свой уклад у развіццё беларускай адукацыі: настаўнікаў і выхавальнікаў, выкладчыкаў і навуковых работнікаў, кіраўнікоў педагагічных калектываў і супрацоўнікаў сістэмы кіравання адукацыяй, усіх, хто сёння падтрымлівае на высокім узроўні жыццядзейнасць айчыннай школы, хто забяспечвае арганізацыю вучэбнага і выхаваўчага працэсу, хто клапоціцца аб развіцці, здароўі і дабрабыце нашых дзяцей.*

*Найважнейшымі каштоўнасцямі сучаснага грамадства даўно ўжо сталі адукаванасць яго грамадзян, іх здольнасць да творчай дзейнасці. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка і Урад нашай краіны аказваюць моцную дзяржаўную падтрымку адукацыі.*

*Дарагія калегі! Я шчыра ўдзячны вам за бескарыслівасць у працы, актыўнасць, уменне працаваць творча. Ваша педагагічнае майстэрства, веды і інтэлект, імкненне да творчага пошуку, цярпенне і настойлівасць у многім вырашаюць шляхі фарміравання новай асобы, здольнай пастаянна павышаць свой адукацыйны і прафесійны ўзровень, плённа працаваць, эфектыўна і граматна весці справы, творча мысліць і прымаць адказныя рашэнні, садзейнічаць росквіту сваёй дзяржавы.*

*Хачу пажадаць, каб вы заўсёды любілі сваю працу, аддавалі ёй свае сілы і душэўнае цяпло, ішлі ў нагу з часам, з годнасцю пераадольваючы перашкоды і цяжкасці, каб вашы вучні часцей вас радавалі і прыемна здзіўлялі.*

*Моцнага вам здароўя, цікавай і плённай працы, рэалізацыі творчых планаў, шырокіх жыццёвых даляглядаў, асабістага шчасця і сямейнага цяпла!*

**Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр РАДЗЬКОЎ.**

## НА ВЫХАДНЫЯ — ДАЖДЖЫ, А З АЎТОРКА ЎНАЧЫ ЗАМАРАЗКІ

**У бліжэйшыя двое сутак надвор'е ў Беларусі будзе вызначацца малярухомым атмасферным фронтам працягласцю ад Брэста да Віцебска, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

У суботу на большай часцы тэрыторыі краіны дажджы, у Брэсцкай вобласці моцныя ліўні. Тэмпература паветра 9—15, па паўднёвым усходзе да плюс 20 градусаў. У нядзелю дажджы будуць назірацца паўсюдна. Тэмпература паветра ўначы 4—9, удзень 8—14 градусаў; па паўднёвым усходзе ўначы 10—12, удзень — 15—17 цяпла.

У панядзелак захаваецца воблачнае надвор'е, месцамі кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы 3—10, удзень 9—16 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, з аўторка па чацвер чакаецца істотнае павышэнне атмасфернага ціску, невялікія дажджы будуць ісці толькі ў асобных раёнах. Тэмпература паветра ўначы 2—9, месцамі замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў, удзень — 9—16 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Падзяліся ўсмешкаю сваёй

**Усе мы жывём добрымі навінамі. У кожнага яны свае — маленькія ці значныя. Але часам варта імі падзяліцца — калі мы радуемся адзін за аднаго, то становімся мацнейшымі і дабрэйшымі. Паспрабуйце і вы адказаць для сябе на адно простае пытанне:**

### ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?

***Наталля КАРЧЭЎСКАЯ, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры харэаграфіі БДУ культуры і мастацтваў:***

— Падышла чарга на кватэру, і чакаецца, што будаўніцтва дома пачнецца яшчэ сёлета, гэта вельмі ўзрадавала. Таму што сям'я вырасла, хочацца, каб у сыноў былі ўмовы для заняткаў і гульняў. Малодшы сын, двухгадовы Хведар, пайшоў у дзіцячы садок, і яму там падабаецца. Гэта таксама мяне радуе, таму што я са спакойнай душой магу пайсці на заняткі да студэнтаў, якія таксама сталі радаваць. Учора на канцэрце Інаўгурацыі новага навучальнага года я разам са студэнтамі танцавала наш любімы нумар «Нью карнавал», які ўжо быў адзначаны падзякай Міністэрства культуры.

***Віктар АСЛЮК, кінарэжысёр-дакументаліст, член Еўрапейскай кінаакадэміі:***

— Сёння дзень нараджэння сына. На днях адзначылі дзень нараджэння мамы. Гэта для мяне цудоўныя святы. Да гэтага часу я скончыў адзін фільм, які здымаў у Расіі, у Карэліі. І пачынаю яшчэ адзін — ужо ў Беларусі. Ідэя прыйшла, калі мне падарылі кнігу «Гіпіка» 1603 года, якую напісаў Кшыштаф Дарагастайскі, маршалак Вялікага Княства Літоўскага. Тры дні таму быў на Ашмяншчыне, дзе яшчэ захаваліся рэшткі будынкаў таго часу. Але і цяпер там, амаль на мяжы з Літвой, ёсць конны цэнтр, дзе рыхтуюцца спартсмены. Прыгожыя коні, сапраўды заварожваюць. Але я яшчэ не ведаю, як гэта перадаць, як і не ведаю, як будзе ісці праца над фільмам. Усё толькі пачынаецца.

***Вячаслаў ІЗОТАЎ, дырэктар Мінскага духоўнага вучылішча Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы:***

Цікавае пытанне. Шмат добрага. У мяне нарадзілася дзяўчынка, шостае дзіця, жывое, здаровае. Роды ў жонкі прайшлі добра. Цяпер у нашай сям'і тры хлопчыкі і тры дзяўчынкі. Малодшую назвалі Ганнай, ужо пахрысцілі. Яшчэ адно маё дзіця пайшло нядаўна ў першы клас. Поспехі ў дзяцей у школе нармальныя. Справы на рабоце ідуць някепска. 24 верасня мяне прызначылі на пасаду дырэктара, усе віншуюць. На гэты навучальны год у вучылішча набралі 20 новых навучэнцаў. Выставы цяпер цікавыя адкрываюцца ў Мінску: выстава старажытных абразоў у Нацыянальным мастацкім музеі і выстава царкоўнага шыцця ў прыходзе абраза «Усіх тужлівых радасць». Ну, гэта калі коратка...

**Ларыса ЦІМОШЫК, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ДВА ГАДЫ ЗА АДЗІН

***Дэпутаты прынялі да ведама дэкрэт кіраўніка дзяржавы аб асобных пытаннях агульнай сярэдняй адукацыі***

**У адпаведнасці з дакументам тэрмін навучання ў агульнаадукацыйных школах складае 11 гадоў.**

Са з'яўленнем так званых штрых-класаў, якім даводзіцца засвойваць двухгадовую праграму за ўдвая меншы тэрмін, колькасць абітурыентаў відавочна будзе значна большай. У сувязі з гэтым колькасць бюджэтных месцаў у ВНУ налета будзе павялічана. У гэтым запэўніў намеснік міністра адукацыі Беларусі Казімір Фарыно, выступаючы на пасяджэнні дзявятай сесіі. Паводле яго інфармацыі, выпускнікоў-2009 будзе каля 107 тысяч. Прычым тых, каму даводзіцца праходзіць два класы за адзін, каля 63 тысяч — як бачым, большая частка патэнцыйных абітурыентаў.

Новыя праграмы для паступлення ў ВНУ плануецца распрацаваць да канца гэтага месяца. Асаблівая ўвага будзе надавацца адпаведнасці праграм для паступлення і тых, па якіх засвойваюць вучэбны матэрыял у штрых-класах.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Цэнтрвыбаркам гатовы «вучыцца» на гэтых выбарах

Учора на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў 110 народных прадстаўнікоў у парламенце былі зарэгістраваныя. Скаргі кандыдатаў аб непрызнанні вынікаў выбараў, якія паступілі ў ЦВК, перанакіравалі акруговым камісіям, паколькі гэта ў іх кампетэнцыі і «звязана з праверкай вялікага фактычнага матэрыялу», як адзначыла старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. І ў выніку нязгоды з рашэннем акруговай камісіі, яго можна аспрэчваць у Цэнтрвыбаркаме. Яна падкрэсліла таксама, што разгляд скаргаў не з'яўляецца перашкодай для падвядзення вынікаў выбараў.

— Мы маем дастаткова шмат інфармацыі, значна больш, чым кожны прадстаўнік палітычнай партыі, паколькі ўсё ж такі ён мае тую інфармацыю, якая прадастаўлена членамі пэўнай партыі, — адзначыла Лідзія Ярмошына ў гутарцы з журналістамі. — Сённяшняе рашэнне прымалася ўсвядомлена менавіта на падставе гэтай інфармацыі. Цалкам верагодна, што мы атрымаем яшчэ нейкія асаблівасці, якія нам дасць разгляд скаргаў у акруговых выбарчых камісіях. Пры ўсім тым, што скаргі ідуць па 20 выбарчых акругах, іх усё ж такі не так шмат. 24 грамадзяніны звярнуліся са скаргамі, а ў выбарах удзельнічалі 263 кандыдаты. Адпаведна астатнія 130 чалавек (110 абраных дэпутатаў задаволеныя выбарамі «па ўмаўчанні». — **Аўт.**) згодныя з вынікамі выбараў.

Старшыня Цэнтрвыбаркама прызнала недахопам, што прадстаўнікі ўчастковых камісій «часам не вельмі добра адкрываюцца, і менавіта гэта выклікала перш за ўсё прэтэнзіі АБСЕ». Аднак, як яна сказала, «пасылы зверху ішлі наконт таго, што назіральнікам павінен быць прадастаўлены поўны аб'ём інфармацыі, і СМІ неаднаразова транслявалі такія мае звароты». Лідзія Ярмошына рэзюмавала, што выбары даюць урокі і Цэнтрвыбаркам будзе працаваць над памылкамі.

— Дрэнна, што не ўвайшлі ў парламент прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партый, — заўважыла старшыня ЦВК. — Зразумела, павінен быць прадстаўлены і другі бок, бо гэта дае разнастайнасць палітычнаму жыццю.

Першае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў чацвёртага склікання прызначана на 27 кастрычніка, а сенатары прыступяць да працы, мяркуецца, на тым жа тыдні — 31 кастрычніка. Вынікі іх выбараў у Савет Рэспублікі, дарэчы, будуць падведзеныя на чарговым пасяджэнні Цэнтрвыбаркама 14 кастрычніка. У той жа дзень прызначаць дадатковыя выбары ў Савет Рэспублікі з-за таго, што адзін з прэтэндэнтаў раней зняў сваю кандыдатуру. І да гэтага пасяджэння ўжо будуць гатовыя рашэнні акруговых камісій па скаргах кандыдатаў у дэпутаты аб непрызнанні вынікаў выбараў. Паўнамоцтвы членаў ЦВК з правам дарадчага голасу да гэтага часу будуць скончаныя і яны змогуць удзельнічаць у пасяджэнні толькі ў якасці назіральнікаў.

**Ала МАЧАЛАВА.**

*На гэтых парламенцкіх выбарах было зэканомлена каля 6 млрд рублёў (з іх 4 млрд захавалі ад растрат сумленныя выбаршчыкі, якія забяспечылі яўку на галасаванне і тым самым знялі патрэбу ў другім туры; астатняя ж пара мільярдаў была зэканомлена ў першым туры, яна пойдзе на прэміяванне супрацоўнікаў выбарчых камісій).*

ISSN 1990 - 763X

Ведай нашых!

## ПРАФЕСІЯНАЛЫ, ПСІХОЛАГІ І ПРОСТА ПРЫГАЖУНІ!

**Учора ў надзвычай урачыстай атмасферы падведзены вынікі 12-га, конкурсу прафесійнага майстэрства сярод начальнікаў гарадскіх і сельскіх аддзяленняў паштовай сувязі.**

На яго, як і трэба было чакаць, з'ехаліся лепшыя з лепшых з усёй краіны, бо гэтаму, рэспубліканскаму, конкурсу папярэднічалі аналагічныя спачатку на раённых узроўнях, потым — на абласных. І ўжо іх пераможцы абаранялі гонар сваіх філіялаў, спаборнічалі за званне лепшых. Некаму яно далося лягчэй, некаму...

— Тут, як на Алімпійскіх гульнях, — прызнала начальнік 14-га аддзялення паштовай сувязі (далей — АПС) Святлана Дынкіна, — спартсменаў з'язджаецца шмат. І ўсе яны моцныя. А золата — выйграюць адзінкі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

***Прыз «Звязды» — начальніку АПС 1 Гарадоцкага РВПС Наталлі СТАРАВОЙТАВАЙ.***

На шляху да яго былі два цяжкія конкурсныя дні з дэманстрацыяй хатніх заданняў і экалагічных куткоў, з «прад'яўленнем» візітных картак і камандных прэзентацый «Пошта і інфармацыйныя тэхналогіі», з больш чым строгай праверкай тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў. Вось на іх якраз (недзе ад хвалявання, недзе — ад разгубленасці) і «правальвалася» большасць канкурсантаў. Але ж былі і тыя, хто дэманстраваў проста бліскучую падрыхтоўку.

— Наша Таццяна Лушчык адказала на 85 пытанняў з 95. Гэта рэкорд! — хваліла дзяўчыну намеснік дырэктара Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Вольга Міхайлаўна Юрашэвіч. — Яна ўзначальвае самае буйное ў Баранавічах аддзяленне сувязі, мае вышэйшую адукацыю. І, дарэчы, не першы раз удзельнае ў конкурсах. У мінулы раз заваявала трэцяе месца, у гэты — першае!

Перамогай, ну безумоўна ж, трэба было пахваліцца! І гучала гэта так:

— Саша, уяўляеш, я — першая!

Саша — гэта муж. Днямі ў іх першая гадавіна вяселля, і падарункам да яе стане сумленна выйграны тэлевізар «Гарызонт».

Сярод іншых прызоў былі лічбавыя фотаапараты і мабільныя тэлефоны, электрачайнікі, гадзіннікі. Яны, як і трэба было чакаць, уручаны пераможцам. Сярод начальнікаў гарадскіх АПС Таццяне Лушчык (Баранавічы), Вользе Дударчык (Мінск), Ірыне Фёдаравай (Слонім). Сярод сельскіх — Святлане Алесіюк (в. Высока-Літоўск Камянецкага раёна), Ірыне Бялько (в. Азарычы Калінкавіцкага раёна) і Кацярыне Будай (в. Азярцо Мінскага...). У камандным першынстве ўжо ў другі раз перамогу заваяваў Брэсцкі філіял РУП «Белпошта».

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

ЗАО «ЭДЭН» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН



по продаже 2-этажного кирпичного здания механического цеха, об. пл. 1433,4 кв.м, расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Волынца, д. 12. Начальная цена – 1 215 000 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,1073 га. Объект продается без условий. Задаток в сумме 50 000 000 белорусских рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **04 ноября 2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03 ноября 2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

## Савет судовых старшыняў СНД

**У Брэсце прайшло пасяджэнне Савета старшыняў вышэйшых арбітражных, гаспадарчых, эканамічных і іншых судоў краін СНД.**

На Савеце старшыні разгледзелі судовую практыку ў сферы ажыццяўлення транспартна-экспедыцыйнай дзейнасці ў краінах СНД. На думку кіраўніка Савета старшыняў — Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларусі Віктара Камянкова, гэта пытанне з'яўляецца вельмі актуальнай тэмай, бо цяпер распрацоўваюцца варыянты стварэння такіх транспартных магістраляў, як «Парыж — Уладзівасток» і па напрамку з Мурманска да буйных гарадоў Ірана. На пасяджэнні прысутнічаў старшыня Асацыяцыі юрыстаў Расіі, Саветнік Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Веніямін Якаўлеў, які лічыць, што на тэрыторыі СНД бываюць выпадкі ўзнікнення чорнага рэйдарства, калі ажыццяўляецца незаконны захоп прадпрыемстваў і кампаній шэрымі эканамічнымі і нават крымінальнымі метадамі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже помещения транспортного назначения – гаража № 293, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Ангарская, 100 в массиве «Северный» (общая площадь – 20,6 кв. м, инвентарный номер 500/D-509444).

Начальная цена – 15 279 390 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 1 500 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **20 октября 2008 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **17 октября 2008 года** до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Минск, Партизанский проспект, д. № 2 (балансодержатель – УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»).

Лот № 2 – производственное помещение общей площадью 67 кв. м, расположенное на первом этаже здания с инвентарным номером 500/С-24990 (помещение в здании ГПК, литер А 1/к-кп).

Начальная цена лота № 2 – 150 843 000 белорусских рублей. Сумма задатка – 15 000 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **20 октября 2008 года** в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **17 октября 2008 года** до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583

## На 17 працэнтаў больш...

*(Пачатак на 1-й стар.)*

### Правілы стануць агульнымі

Як вядома, у сталіцы існуе ўласная «гарадская» праграма падтрымкі некаторых катэгорый сацыяльна неабароненых грамадзян. Плюс да таго, варта нагадаць, што літаральна ў верасні ўлады Мінска прынялі рашэнне аб прадастаўленні дадатковых выплат «на бульбу» пенсіянерам, з даходамі менш за 3 бюджэты пражытковага мінімуму. Справа, безумоўна, добрая. І разам з тым не сакрэт: падобныя меры далёка не аднназначна ўспрымаюцца жыхарамі іншых абласцей Беларусі. «У нашай краіне без датацый абыходзяцца толькі Мінск і Гомельская вобласць, таму калі ёсць фінансавыя магчымасці і кіраўніцтва тых або іншых рэгіёнаў аказваюць сваім жыхарам дадатковую дапамогу — гэта можна толькі вітаць, — адзначыў Уладзімір Патупчык. — У той жа час трэба пагадзіцца: усе павінны знаходзіцца ў аднолькавых умовах. Таму цяпер НДІ працы пачаў распрацоўку адзінага норматыву сацыяльнай забяспечанасці на аднаго жыхара — з тым, каб выраўняць паказчыкі фінансавання нашых устаноў у цэлым па краіне».

### Хоспіс у кожным рэгіёне?

Адзін тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання на адзін адміністрацыйны раён краіны — гэта формула існуе вось ужо некалькі гадоў. Тым не менш напрамкі сацыяльнай падтрымкі павінны пашырацца. У прыватнасці, адзін з такіх напрамкаў — хоспісы. «Гэта вельмі важна, — зазначыў Уладзімір Патупчык. — Сёння ў дамах-інтэрнатах пражывае шмат пажылых людзей, якія маюць значныя праблемы са здароўем або ўвогуле прыкаваны да ложка. На жаль, пакуль нашы ўстановы прадаставіць увесь комплекс неабходных паслуг гэтым людзям не могуць — для іх догляду павінны быць створаны зусім іншыя ўмовы. Таму рашэнне аб развіцці хоспісаў вельмі своечасовае, і мы спадзяёмся, што з цягам часу падобныя ўстановы з'явяцца ва ўсіх раёнах Беларусі».

Ёсць намер павялічыць колькасць дамоў начнога знаходжання для асобаў без пэўнага месца жыхарства.

Застаецца востры праблема дэфіцыту месцаў у дамах-інтэрнатах. Праўда, датычыцца яна толькі сталіцы. Чарга на змяшчэнне ў стацыянарныя сацыяльныя ўстановы Мінска цяпер складае каля 400 чалавек, апроч таго, у горадзе бракуе каля 600 месцаў, неабходных для прывядзення ўмоў пражывання ў інтэрнатах да санітарнай нормы — 7 квадратных метраў плошчы на кожнага чалавека. «Каб зняць усе пытанні, была прынятая рэспубліканская праграма развіцця ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання, — заўважыў Уладзімір Патупчык. — Ці не самай адметнай задачай праграмы вызначана ліквідацыя дэфіцыту плошчаў ва ўсіх рэгіёнах, у тым ліку, у сталіцы да 2010 года. Прычым на выкананне праграмы выдаткоўваюцца неабходныя сродкі — каля 213 млрд рублёў».

**Сяргей ГРЫБ.**

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже конфискованного имущества: двухкомнатная квартира № 127, расположенная по адресу: г. Минск, проспект Машерова, д. 76 (общая площадь – 46,9 кв. м, жилая площадь – 26,8 кв. м).

Начальная цена 191 819 420 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 19 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **20 октября 2008 года** в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **17 октября 2008 года** до 16.45 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017)227 48 36.

УНП 190398583



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*«Саша, я першая!» — паведамляе мужу начальнік АПС 9 г. Баранавічы Таццяна ЛУШЧЫК (побач з ёй — таксама першая — Святлана АЛЕСІЮК з АПС Высока-Літоўск Камянецкага РВПС.*

## ПРАФЕСІЯНАЛЫ, ПСІХОЛАГІ І ПРОСТА ПРЫГАЖУНІ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дыпломамі адзначаны лепшае хатняе заданне (вытворчасць «Мінская пошта»), лепшы «Экалагічны куток» паштавікоў Гродзеншчыны, лепшы дызайн фірменнага касцюма — Магілёўшчыны, натхненне і артыстызм — Віцебшчыны...

Здаецца, ніводная з камандаў, ніводны з удзельнікаў не застаўся без узнагародаў, без, хай дробных, але памятных прызоў. Уручалі іх і прадстаўнікі рэдакцый, што выглядала цалкам лагічна, бо каму ж яшчэ, як не паштавікам (тым больш — лепшым з лепшых)! І калі, як не на конкурсе, яны збяруцца зноў?

Гадзіннікі з лагатыпам газеты «Звязда» ўручаны, можна сказаць, ветэрану пошты Святлане Дынкінай (АПС 14, г. Мінск) і... навічку — Наталлі Старавойтавай (АПС 1, г. Гарадок), фірменныя блакноты і ручкі ўсім удзельнікам урачыстасцяў, якія выпісваюць газету не толькі іншым, але і сабе дамоў. Што вельмі прыемна — высветлілася, што сярод іх і тая самая Наталля Старавойтава, і намеснік начальніка аддзела паштовай сувязі Міністэрства інфарматызацыі краіны Раіса Аляксандраўна Жыгалка, намеснік дырэктара Мінскага філіяла РУП «Белпошта» Алена Уладзіміраўна Трубач, Брэсцкага — Вольга Міхайлаўна Юрашкевіч, маці пераможцы Таццяны Лушчык, бацька старшыні журы, намесніка генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Ірыны Ігнацьеўны Саксонавай...

У якой і спыталі: хто ён — начальнік аддзялення паштовай сувязі сёння — якімі якасцямі павінен валодаць?.. А яшчэ — чым гэты конкурс прафесійнага майстэрства адрозніваўся, ну напрыклад, ад першага?

Пра пасаду начальніка Ірына Ігнацьеўна сказала так:

— Ён павінен бездакорна ведаць справу і гэтак жа бездакорна валодаць камп'ютарам, быць прыгожым, абаяльным чалавекам і вельмі добрым псіхолагам. Бо трэба ж знайсці падыход не толькі да сваіх супрацоўнікаў, але і да кожнага кліента, для таго, каб максімальна хутка і якасна абслужыць... А яшчэ — зрабіць так, каб яму хацелася прыходзіць да нас зноў і зноў — афармляць падпіску, купляць паштоўкі, плаціць за камунальныя паслугі, пагашаць крэдыты...

Што датычыцца саміх конкурсаў, на першыя — удзельнікі, каб паказаць свае хатнія заданні везлі цэлыя «вагоны рэквізіту» — пасылачныя скрынкі, клейкую ленту, сургуч, шпагат... Цяпер усё гэта ў мінулым — бо работа хоць гарадскога, хоць сельскага аддзялення сувязі поўнасцю камп'ютарызавана... Мы далей пайшлі: у Рэчыцкім раёне ў нас ужо працуюць мабільныя пошты. Гэта значыць, што ў пэўны час нават у самую з аддаленых вёсак прыязджае наш аўтамабіль. І работнік аказвае абсалютна ўсе паслугі.

А таму можна, відаць, прызнаць, што пошта не проста ідзе ў нагу з часам, яна... едзе. Не адмаўляючыся пры гэтым ад добра забытага старога — конкурсаў прафесійнага майстэрства, спаборніцтва паміж вузламі сувязі, спартыўных спартакіяд, аглядаў самадзейнасці... Бо яно ж і насамрэч не працай адзінай...

**Валянціна ДОЎНАР.**

## Абзац

■ Экіпаж верталёта Мі-26 МЧС Беларусі, які тушыў лясныя пажары ў Грэцыі, сёння вяртаецца дадому. 18 выратавальнікаў прыбудуць у другой палове дня на аэрадром Ліпкі пад Мінскам.

**■ Штодзень па медыцынскую дапамогу ва ўстановы аховы здароўя Мінска звяртаюцца 3,5 — 4 тыс. грамадзян, крыху больш за палову з іх — дзеці. Між тым дыягназ «грып» урачы нікому з іх яшчэ не паставілі. Паводле прагнозаў медыкаў, на працягу кастрычніка ўзровень захворваемасці будзе не больш 20 тыс. чалавек у тыдзень. Эпідэмічны ўздым па грыпу і ВРВІ чакаецца ў студзені наступнага года. А пакуль урачы рэкамендуюць умацоўваць імунітэт.**

■ Беларуская міліцыя выкарыстоўвае дэтэктар хлусні для раскрыцця злачынстваў, паведаміў журналістам галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС Беларусі Валянцін Міхневіч. З дапамогай паліграфа, сказаў ён, раскрываюцца нават серыі забойстваў, напрыклад, як гэта было ў Гродзенскай вобласці.

**■ Лясная куніца, што забралася ў буйны вылічальны цэнтр Гановера, на некалькі гадзін паралізавала працу каля 150 банкаў Германіі. У выніку аварыі на працягу васьмі гадзін не працавалі банкаматы па выдачы наяўных грошай на паўночным усходзе Германіі, а таксама ў зямлі Саар. Немагчыма было таксама ажыццяўленне банкаўскіх аперацый у рэжыме он-лайн. Звярок выклікаў кароткае замыканне, якое прывяло да спынення падачы электраэнергіі на галоўны камп'ютар, які кіруе банкаўскімі аперацыямі. Ад удару токам загінула і куніца.**

■ У штаце Масачусэтс (ЗША) гарбуз вагой 816,48 кг прэтэндуе на рэкорд Гінэса. Уладальнікам гарбуза з'яўляецца Стыў Каналі, які вырасціў яго на заднім двары свайго дома. Усё лета ён падкормліваў гарбуз чысцюткім гноем, кампостам з кляновых лістоў, угнаеннем з марскіх водарасцяў і адходамі рыбы. Намаганні былі недарэмнымі — гарбуз прыбаўляў у вазе 20 кг штодзень. Папярэдні рэкардсмен у гэтай намінацыі важыў 766,13 кг.

## Поўны абзац

**■ Пракуратура Сормаўскага раёна ў Ніжнім Ноўгарадзе накіравала ў суд крымінальную справу мясцовага жыхара, які ў парыве злосці з'еў старонку са штампам аб рэгістрацыі шлюбу з пашпарта сваёй былой жонкі, яму пагражае да аднаго года пазбаўлення волі. Старонку з пашпарта ён з'еў у прысутнасці былой і цяперашняй (грамадзянскай) жонак. Пасля разводу былая жонка засталася жыць у доме, які належыць мужу, дзе была прапісаная. Супрацоўнікам міліцыі, якія прыбылі па выкліку на сямейны скандал, яна спрабавала паказаць свой пашпарт са штампам рэгістрацыі, але муж вырваў яго і з'еў адпаведную старонку. Ён абвінавачваецца па артыкулах аб пашкоджанні афіцыйных дакументаў, пабоях, знявазе і пагрозе забойства.**

■ Аўстралійскі хлопчык скарміў кракадзілу дарагіх рэптылій з заапарка. Сямігадовае дзіця пералезла ў заапарк праз трохметровы паркан. Камера відэаназірання зафіксавала, як хлопчык на працягу паўгадзіны забіваў рэдкіх жывёлін каменем і кідаў 200-кілаграмоваму кракадзілу па мянушцы Тэры. Усяго загінулі 12 яшчарак і чарапаха, кошт якіх $5,5 тыс. Па мясцовых законах хлопчык не можа несці адказнасці, паколькі яму няма 10 гадоў. Супрацоўнікі заапарка маюць намер падаць у суд на яго бацькоў.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

*Мядельский районный исполнительный комитет (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договоров аренды земельных участков сроком на 15 лет для размещения торговых павильонов в Минской обл., Мядельского р-на, к.п. Нарочь, ул. Ленинская:

| № лота | Площадь земельного участка, кадастровый номер | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Сумма потерь с/х производства (бел. руб.) | Расходы, связанные с подготовкой документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | участок № 1, пл. 0,0199 га, 624056300001000238 | в непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения, канализации | 3 150 668 | 18 828 000 | 853 104 по каждому лоту |
| 2 | участок № 2, пл. 0,0176 га, 624056300001000237 | | 2 786 520 | | |
| 3 | участок № 3, пл. 0,0184 га, 624056300001000236 | | 2 913 180 | | |
| 4 | участок № 4, пл. 0,0185 га, 624056300001000235 | | 2 929 012 | | |

**Примечание:** земельные участки расположены в водоохраной зоне озера Нарочь.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата предмета аукциона должна быть произведена в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка. Договор аренды земельного участка заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона, возмещения расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещения потерь сельскохозяйственного производства. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **11.11.2008 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.11.2008 года до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

*Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.*

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости». УНП 690324015.*

Узденский райисполком (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Константиново, Узденского района:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Узденский район, д. Константиново, (Теляковский с/с) 625683401601000023 | 0,2499 га | сети электроснабжения, водоснабжения | 2 500 000 | 250 000 |

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы в сумме 745 486 бел. рублей, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **04.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

## Будуць ждановіцкія ананасы?

**Днямі група журналістаў мінскіх друкаваных і электронных СМІ наведала агракамбінат «Ждановічы». Мэтай паездкі стала знаёмства з вопытам гэтага знакамітага ўнітарнага прадпрыемства ў рэалізацыі дзяржаўнай праграмы імпартазамяшчэння. А менавіта, агародніны і садавіны. Журналісты на свае вочы пераканаліся ў тым, што агракамбінат «Ждановічы» — гэта высокаэфектыўнае сучаснае прадпрыемства з вялікай будучыняй.**

Генеральны дырэктар Рыгор Чуйко заўважае, што вытворчасць агародніны і садавіны — даволі рызыкоўны занятак. Яна не можа доўга захоўвацца на складах, мае кароткі тэрмін спажывання. А яшчэ ва ўмовах рынку трэба ўмець не прамахнуцца з цаной. Бо можна трапіць у непрыемную сітуацыю, калі канкурэнты перапаманілі спажыўцоў больш прывабнымі цэнамі на аналагічную прадукцыю і ты застаўся сам-насам з тонамі сваіх агуркоў ды таматаў. Нюансаў тут шмат. Таму вытворцу гародніны і садавіны пажадана без прамаруджвання рэалізоўваць прадукцыю, інакш замест прыбытку можна атрымаць значныя страты. Каб твой тавар не залежваўся, трэба не толькі заваяваць давер пакупніка, але і пастаянна падтрымліваць яго попыт і інтарэс, пашыраць кола спажыўцоў.

— Дзеля гэтага трэба свой якасны тавар прадаваць па прымальнай цане, — гаворыць Рыгор Чуйко.

У «Ждановічах» эканамічная мэтазгоднасць з'яўляецца, без перабольшвання, асноўным законам гаспадарання. Відаць, яго выкарыстанне і дазваляе агракамбінату не першы год трывала займаць сваю нішу, мець лепшыя ў краіне паказчыкі сярод роднасных прадпрыемстваў. Спецыялісты гаспадаркі расказвалі, што яны пастаянна працуюць над тым, як да мінімуму звесці ўсе вытворчыя і невытворчыя выдаткі, якія потым адбіваюцца на сабекошце прадукцыі і могуць зрабіць яе неканкурэнтназдольнай.

У гэтым сэнсе важкім укладам у павышэнне рэнтабельнасці вытворчасці сталі рамонт дзеючых цеплатрас, рэканструкцыя кацельні, якую абсталявалі найноўшымі замежнымі катламі і абсталяваннем. Грошай на гэта не пашкадавалі. Рэканструкцыя дазволіла істотна скараціць спажыванне электраэнергіі і газу (ён, нагадаем, за даволі кароткі тэрмін падаражэў аж утрая для гаспадаркі), што ў сваю чаргу паўплывала на зніжэнне сабекошту гародніны і садавіны — больш чым на 25 працэнтаў. А будаўніцтва ўласнай міні-ЦЭЦ, мяркуюць у агракамбінаце, дапаможа яшчэ больш скараціць выдаткі на вытворчасць.

Невыпадкова ждановіцкая якасная прадукцыя без праблем знаходзіць шлях да спажыўца. Агароднінай агракамбіната сёння гандлююць многія мінскія магазіны. Толькі на сталічным Камароўкім рынку таматы і агуркі са «Ждановічаў» прапануюць дзясяткі гандлёвых пунктаў. Усяго ў агракамбіната заключана больш за 600 дагавораў на пастаўку сваёй агародніны. Цяпер прапрацоўваюцца пытанні яе паставак у гіпер- і супермаркеты ўжо ў расфасаваным выглядзе і ва ўпакоўцы.

У «Ждановічах» добра разумеюць, што цяперашнія здабыткі і поспехі — не прычына для самасупакойвання. На рынку Беларусі застаецца даволі моцная канкурэнцыя з боку імпарцёраў агародніны і садавіны з іншых краін. А яны, між іншым, нярэдка прапаноўваюць свой тавар па меншых цэнах. Выйсце тут адно: па-ранейшаму зніжаць затраты на адзінку прадукцыі, лічыць Рыгор Пятровіч.

Кінулася ў вочы, што стыль гаспадарання тут адрозніваецца ў першую чаргу наватарскім падыходам да працы кіраўніцтва і ўсяго калектыву. Сёння тут так званы чалавечы фактар паспяхова працуе на агульныя мэты. Шмат цікавых задумак і планаў на перспектыву прапрацоўваецца цяпер мясцовымі спецыялістамі. Новыя падыходы — гэта і вынік іх агульных прапаноў, ідэй, ацэнак, назіранняў у час замежных камандзіровак ў Галандыю, Германію, іншыя краіны, дзе вытворчасць агародніны і садавіны пастаўлена лепш, чым дзе-небудзь, а тэхналогіі варты пераймання.

Нядаўна быў закладзены сад на 46 гектараў. І гэта толькі пачатак, кажа Рыгор Пятровіч. Паводле яго слоў, ёсць праект саду на 500 гектараў. Там будуць выкарыстоўвацца перспектыўныя высокаўраджайныя гатункі дрэў, па-новаму наладжаны іх догляд — пад кожнае дрэва будзе праведзены паліў, каб на ўраджай не паўплывала нечаканая засуха. У «Ждановічах» спадзяюцца адрадзіць былую славу беларускіх садаводаў і з часам забяспечыць жыхароў сталіцы экалагічна чыстымі, смачнымі і духмянымі яблыкамі.

У планах калектыву вырошчванне экзатычнай садавіны: ананасаў, лімонаў, грэйпфрутаў і г. д. Разам з тым думаюць сур'ёзна і аб тым, каб у значных аб'ёмах наладзіць і паступова павялічваць вытворчасць агародніны і садавіны на адкрытым грунце, палепшыць умовы іх захоўвання, па меры магчымасці наладзіць перапрацоўку.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА,**
*Мінскі раён.*

*Открытое акционерное общество «ДСТ № 2, г. Гомель»*

сообщает о включении в повестку дня внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится

**7 октября 2008 года**

по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж, конференц-зал, дополнительного вопроса

**«О ПОДТВЕРЖДЕНИИ СОГЛАСИЯ НА УВЕЛИЧЕНИЕ УСТАВНОГО ФОНДА ОАО «ДСТ № 2, г. ГОМЕЛЬ».**

УНН 400022426

**В извещении о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Червенский молочный завод»,**

*опубликованном в газете «Звязда» от 02.10.2008 г.,*

**ВНЕСТИ СЛЕДУЮЩИЕ ИЗМЕНЕНИЯ**

«аукцион состоится 21.10.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326».

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «ЖАБИНКОВСКИЙ САХАРНЫЙ ЗАВОД»
**14 октября 2008 года состоится**

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Жабинковский сахарный завод»,**
*расположенного по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина.*

Собрание пройдет по адресу: г. Жабинка, ул. Калинина, зал заседаний заводоуправления.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О согласовании благотворительной (спонсорской) помощи.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 7 октября 2008 г. по 13 октября 2008 г. по месту нахождения Общества: г. Жабинка, ул. Калинина, заводоуправление (отдел кадров) с 8.00 до 16.30, 14 октября 2008 г. по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 12.00 до 12.45 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 14 октября 2008 года, 13.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 6 октября 2008 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

*УНП 200037600*

**ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»**
**6 ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5,**

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже объекта республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания с установлением начальной цены продажи объекта, равной одной базовой величине — единый предмет аукциона

**На аукционные торги выставляется:**

| Сведения об объекте, место нахождения | Основные характеристики объекта | Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания объекта, га (для каких целей) | Срок аренды земельного участка, лет | Начальная цена предмета аукциона, руб. (в т.ч. обекта/ аренды земельного участка) | Сумма задатка предмета аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Незавершенное строительством капитальное строение – здание физкультурно-оздоровительного комплекса, расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Нормандия-Неман, 167 | Здание трехэтажное, стены кирпичные (степень готовности – 100 %), перекрытия – железобетонные плиты (степень готовности – 70 %), кровля – рубероид (степень готовности – 10 %), общая площадь строения 5113,41 кв. м. Строительство велось в период с 1989 по 1991 гг. Степень готовности – 25 % | 0,5109 (для обслуживания незавершенного строительством капитального строения) | 25 | 34 987 262 (одна базовая величина, установленная на дату проведения аукциона/ 34 952 262) | 1 800 000 |

**Условия использования земельного участка: для обслуживания незавершенного строительством капитального строения.**

Продавец недвижимого имущества: Государственное учреждение образования «Институт повышения квалификации и переподготовки кадров Министерства по чрезвычайным ситуациям Республики Беларусь», расположенное по адресу: Минская область, Борисовский район, пос. Светлая Роща, тел.: (80177) 74 84 51, 76 08 21.

**Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет.

**Условия участия в аукционных торгах:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание покупателем не менее 3-х рабочих мест; запрещена продажа покупателем, иное отчуждение объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**К участию в аукционных торгах допускаются** негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Борисовским райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка.

3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2 но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108 и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

***Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 5 ноября 2008 г. до 13.00.***

## Конкурсная дойка

**У Крычаўскім раёне вызначылі лепшых даярак. У СВК «Бель» прайшоў конкурс прафесійнага майстэрства аператараў машыннай дойкі.**

У Доме культуры сабраліся дзевяць камандаў, якія прадставілі ўсе сельскія гаспадаркі Крычаўшчыны і прафесійны аграгэхнічны каледж. У кожнай камандзе — тры чалавекі. Сярод жанчын самых розных узростаў былі і два мужчыны-жывёлаводы.

У спаборніцтвах — тры этапы: на першым даяркі цягнулі білеты з тэарэтычнымі пытаннямі, на другім збіралі і наладжвалі даільныя апараты, а для трэцяга накіраваліся на ферму даіць кароў.

Гледачоў на конкурсе было шмат. Яны горача падтрымлівалі свае каманды і спачувалі, калі нешта не атрымлівалася. Былі і такія выпадкі, што першацёлкі не слухаліся даярак, брыкаліся і даводзілі жанчын ледзь не да слёз.

У выніку лепшай прызнана каманда СВК «Бель». Пераможцам уручылі мікрахвалевую печ, якую мяркуецца паставіць на ферме ў пакоі для адпачынку: даяркам будуць даступны гарачыя ежа і напоі.

Першай у тэорыі стала Надзея Бабаева з СВК «Звязда-агра». Спрытнейшай за іншых у зборцы даільнага апарата была Алена Болдасава з СВК «Бель». А лепшую дойку правяла Таццяна Бурсакава з гэтага ж СВК. Жанчынам уручылі грашовыя прэміі.

На конкурсе даярак усе ўдзельнікі атрымалі памятныя сувеніры, а таксама і пажаданні — правесці падобныя конкурсы прафесійнага майстэрства ў сваіх гаспадарках.

Завяршылася ўсё танцамі, дзе лепшыя даяркі Крычаўскага раёна прадэманстравалі сваё майстэрства не толькі добра працаваць, але і весяліцца.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Госць-забойца

**У Століне па вул. Коласа ў адным з дамоў разыгралася трагедыя. У госці да 44-гадовай жанчыны, якая пражывала разам з 22- і 16-гадовай дочкамі, прыйшоў жыхар райцэнтра.**

Прыкладна ў 2 гадзіны ночы ён кухонным нажом моцна парэзаў гаспадыню, якая з рэзанымі ранамі грудзей, жывата, спіны была дастаўлена ў бальніцу, старшая дачка загінула на месцы, а малодшая пасля ўдару нажом у грудзі памерла ў машыне хуткай дапамогі.

Злачынца арыштаваны.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Тэму падказала пісьмо

# ДАКАЖЫ ЦЯПЕР, ШТО І ТЫ СПАДЧЫННІК...

**З вёскі Ліпск у «Звязду» прыйшло пісьмо ад Галіны Дыдышкі. Жанчына расказала аб праблеме, з якой яна сутыкнулася. Пасля сустрэчы з Галінай Міхайлаўнай і наведвання афіцыйных устаноў я вырашыў напісаць гэты артыкул, бо гісторыя павучальная.**

У райцэнтры жыла сястра нашай чытачкі, але здарылася так, што ў яе памёр муж, а затым і яна. Засталіся тры сыны — людзі дарослыя, але не зусім прыстасаваныя да жыцця. Хвароба сёння распаўсюджаная — цяга да гарэлкі.

Віктар і Аляксей былі халасцякамі, а Мікалай сын быў жанаты, але па нейкай прычыне сям'ю пакінуў і апынуўся на «хіміі», бо не плаціў аліментаў.

Галіна Дыдышка перажывала за пляменнікаў, але нічога зрабіць не магла. Па-першае, жыла да іх за 30 км, а па-другое, калі людзям далёка за трыццаць, то мазгі «ўставіць» ужо цяжка. Тыя, хто любіць выпіць, часта трапляюць пад уплыў іншых. Віктар з Аляксеем, бадзяючы, былі пад наглядам суседкі.

Галіна Міхайлаўна кажа, што тая суседка хлопцаў трымала пад поўным кантролем, але так яно ці інакш, невядома, бо словы да справы не падшыеш. Нідзе не зафіксавана, што жанчына мэтанакіравана спойвала бесталковых і іх, што яны дзейнічалі згодна з яе ўказаннем.

А найбольш трывога ахапіла цётку, калі Віктар і Аляксей прадалі бацькоўскі дом, бо як паказвае жыццё, зрабіць гэта людзі, нераўнадушныя да алкаголю, могуць і за бутэльку. Вось з гэтай прычыны і была напісана заява ў міліцыю. Пачалося расследаванне.

Прадаць дом вельмі лёгка — узяў грошы і бывай, але той, хто купляе, хоча, каб усё было аформлена ў адпаведнасці з законам — яму патрэбен адпаведны дакумент на куплю-продаж.

Пазнаёміўшыся з вынікамі расследавання, магу сказаць, што ніякіх парушэнняў у гэтай здзелцы не бачна. Усе бакі, як і натарыус, заяўляюць, што ніхто ні да кога прэтэнзій не мае. Віктар і Аляксей сказалі, што яны былі цвярозыя і натарыус ім усё растлумачыў. Пакупнік дома таксама пацвердзіў, што прадаўцы не былі п'янымі.

Што датычыцца грошай, выплачаных за дом, то 28 млн 800 тыс. рублёў ляжаць на банкаўскім рахунку Віктара.

Усё. Чалавек заплаціў грошы, атрымаў дакументы і засяліўся ў дом, а Віктар і Аляксей пайшлі жыць у дзядзькаву хату на суседні завулак і ўжо там даюць душы волю, тым больш што і суседка побач.

Пакуль што ў нас размова ішла пра двух братоў, якія прадалі дом, але ж яшчэ ёсць і трэці брат, а ён застаўся без хаты і грошай. Гэты факт надта найбольш і хвалюе Галіну Дыдышку.

Каб уступіць у спадчыну, неабходна на працягу 6 месяцаў звярнуцца ў натарыяльную кантору і напісаць заяву, што прэтэндуеш на спадчыну. Віктар з Аляксеем прыйшлі афармляць спадчыну ў лістападзе, хоць паўгода мінула ў верасні, але да іх прэтэнзій не было, бо ў бацькоўскай хаце яны былі прапісаныя і фактычна прынялі спадчыну. Мікалай прапісаны быў у цешчы і яму патрэбна было звярнуцца да натарыуса на працягу паўгода, а калі гэтага ён не зрабіў, то згубіў права на дом. І хоць на момант продажу дома Мікалай адбываў пакаранне, але «хімія» — гэта не турма, і ён мог без праблем падаць тую заяву натарыусу.

Браты, вядома, паступілі не лепшым чынам, можна было папярэдзіць брата, выслухаць яго думку і не спяшацца прадаваць дом. Ёсць у гэтай справе, акрамя юрыдычнага, і маральны бок.

Цяпер ужо не цётка, а пляменнік піша заявы і хоча, каб узяла верх справядлівасць. А гэта жаданне вярнуцца на зыходную пазіцыю — у бацькоўскую хату. Для гэтага патрэбна ануляваць акт куплі-продажу і выселіць з дома новага гаспадара, які набыў дом на законнай падставе.

На гэтым прыкладзе мы бачым, што чалавек сам стварыў праблему — напісаў бы своечасова і сёння сядзеў бы ў родным доме і ніхто не здолеў бы той дом без згоды Мікалая прадаць, а калі б прадалі, то падзялілі б грошы на траіх.

Каб дом не быў прададзены, то можна было б прыйсці да паразумення. А цяпер на што спадзявацца? На суд?

А суд, калі для яго закон «не дышаль», найперш, звяртае ўвагу на дакументы, а не на эмоцыі і чуткі. Адна даведка можа пераважыць буру эмоцый.

У гэтай гісторыі перасекліся закон і мараль. Можна доўга разважаць пра маральны бок справы, заклікаць да справядлівасці — цягнуць гуму, а закон, як забіты цвік — такі, які ёсць.

Я паспрабаваў звязацца з Мікалаем. Ён працуе не ў Ляхавіцкім, а як сказала яго цётка — за Баранавічамі. Але па тэлефоне адказалі, што ў іх такога чалавека няма, ды для нас гэта і не важна.

Проста ёсць яшчэ адна магчымасць напомніць чытачам, што ўсе праблемы звязаныя са спадчынай (і не толькі), неабходна вырашаць своечасова, каб потым не махаць рукамі і ўздыхаць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ,**
*Ляхавіцкі раён.*





Жыхары вёскі Боркі Ганцавіцкага раёна жывуць непадалёк ад балота, дзе і збіраюць такой парой журавіны. Многія нават бяруць адпачынак спецыяльна на час нарыхтовак ягады.

Занятак гэты нельга назваць прыемным хобі, хутчэй, цяжкай работай, паколькі прайсці да ўраджайных мясцін пару кіламетраў па багністаму «долу» — ужо праблема. Жанчыны збіраюць ягады з палову дня і нясуць сваю «здабычу» на спінах, у мяшках. Часам па 25-30 кілаграмаў... Але на жыццё не наракаюць. Кажуць, што выраслі на балоце і цудоўна сябе ў тутэйшых мясцінах адчуваюць. За кілаграм журавін нарыхтоўшчыкі плацяць жанчынам па 5 тысяч рублёў...

**Фота Васіля ФЕДАРЭНКІ.**

# Людзі на журавінавым балоце



Транспартная філасофія

# КАЛІ МЫ ЧУЕМ ГОЛАС СЭРЦА



— Можа, махнуць па кальцавой? — пытаецца ці то ў мяне, ці то ў сябе самога ранішні таксіст.

— Зразумела, па кальцавой, — падтрымліваю размову я. — Так хутчэй дабяромся.

— Ага, на дзесяць кіламетраў больш! — адгукаецца вадзіцель. — Атрымліваецца адно на адно. Мы не зэканомім час па кальцавой.

Я не спрачаюся. Мне ўсё роўна, па якой дарозе, галоўнае — каб давёз. Але едзем мы чамусьці па кальцавой. Пасля доўгай паўзы я вырашаюся запытаць:

— І чаму мы паехалі гэтай дарогай?

— Не магу патлумачыць. У мяне ёсць унутранае пачуццё. Ім і кірууюся. Калі жонка ці сын вырашаюць свае важныя справы заўсёды прыходзяць да мяне па параду: як ты адчуваеш, што мне лепш зрабіць? У нас у Маскве была кватэра. Там ніхто не жыў, збіраліся прадаваць. Ужо і пакупнік знайшоўся. А я кажу жонцы: лепш не трэба, чуе душа, не трэба яе зараз прадаваць. Яна мяне тады не паслухала. І за пару месяцаў, пакуль мы афармлялі дакументы, адбылася жудасная інфляцыя. Мы засталіся без кватэры і без грошай. Вось з тых часоў і прыходзяць да мяне раіцца.

* * *

У мяне таксама ёсць унутранае чуццё, інтуіцыя. Калі раніцай давядзецца доўга стаяць у заторы і спазняцца на працу, я ведаю пра гэта з вечара, таму тэлефаную і пераношу ўсе запланаваныя сустрэчы на пазней. Так і здараецца. Я заўсёды прадчуваю радасныя падзеі і своечасова рыхтуюся да сумных.

Добра, калі інтуіцыя дадзена ад нараджэння. Але шостае пачуццё можна і развіць. Уменне прадчуваць можа стаць кіраўніком па жыцці.

Інтуіцыю часта можна зблытаць з думкай. «Думка па сваёй сутнасці ментальная, — піша індус Абішэк Такор, выканаўчы дырэктар «Цэнтра дабрабыту Такора» ў Мумбаі, дзе вучыць стратэгіі духоўнага поспеху і мастацтву кіраваць адносінамі. — Думка належыць розуму. Інтуіцыя, з іншага боку, з'яўляецца адказам цела. Сэрца таксама адчувае інтуітыўныя веды. Многія падчас праяўлення інтуіцыі адчуваюць лёгкія дрыжыкі».

Каб развіць інтуіцыю, трэба слухаць свае ўнутраныя пачуцці. Калі вы нешта адчулі, скажыце пра гэта іншаму чалавеку ці запішыце на паперы, а пасля праверце, ці збыліся вашы адчуванні. Інтуіцыя — гэта голас сэрца. Людзі, у якіх чыстае сэрца, лепш валодаюць інтуіцыяй, таму не захоўвайце злых пачуццяў, не трымайце зла на іншых. Здольнасць прадчування развіваецца тады, калі вы ім карыстаецеся. Спрабуйце здагадацца, якім бокам упадзе манета, якой масці выцягнеце карту і г. д. Часцей прыслухоўвайцеся да свайго сэрца, задавайце яму пытанні і слухайце адказы.

* * *

А ўвечары патэлефанавала мая мамачка і, як заўсёды, з клопатам сказала: «Таня, часцей купляй маркоўны сок. У мяне развітая інтуіцыя, і яна мне зараз падказвае, што табе патрэбны вітаміны». Не ведаю, інтуіцыя гэта ці мацярынскае чуццё, але мне сапраўды трэба павысіць імунітэт. Дзякуй, мамачка! Я слухаю тваё сэрца. І сваё таксама.

**Таццяна САЛДАЦЕНКА.**

# ДВАЦЦАЦЬ ТЫСЯЧ ЗА ШЧАСЦЕ

## Дзякуючы клубу знаёмстваў «Спатканне» Маладзечанскага гарадскога Палаца культуры, кожны год у горадзе на два вяселлі болей

**Лідзія Іванаўна* баялася заставацца дома адна. Пасля смерці мужа яе так палохала цішыня ў кватэры, што яна не магла нават спакойна спаць. У адну з бяссонных начэй да пенсіянеркі прыйшла думка аб тым, што было б добра знайсці памяркоўнага і гаспадарлівага чалавека, які таксама застаўся без сваёй палавінкі. Яна б варыла яму супы, ды і словам было б з кім перакінуцца. Але перабраўшы ў галаве сваіх знаёмых, жанчына ўздыхнула: усе, хто падпадаў пад гэтыя крытэрыі, былі пры жонках. І тады яна вырашыла звярнуцца па дапамогу ў клуб знаёмстваў.**

У «Спатканні» па ўзросце ёй лепш за ўсё падыходзіў Ягор Анатольевіч. Праўда, у клубе доўга сумняваліся, ці трэба ўзвальваць на плечы ўжо немаладой жанчыны са сваімі ўзроставымі «балячкамі» клопат аб зусім хворым чалавеку. На той момант мужчына ледзьве хадзіў, і на ўсе пасяджэнні яго прыцягваў сябар, падхапіўшы пад пахі. Так іх і выправілі на спатканне — удваіх.

«Лідзія Іванаўна, пасылаем вам двух кавалераў, — папярэдзілі жанчыну. — Самі выберыце, які лепшы!»

Лепшым аказаўся Ягор, і ніякія хваробы жанчыну не спалохалі. Больш за тое, у хуткім часе пара згуляла вяселле: ёй на той момант было 62, яму — 67. А замест дзвюх кватэр, што апастылелі ім за гады адзіноты, яны купілі адну агульную.

Ягора Анатольевіча цяпер не пазнаць: здаровы, квітнеючы і не тое што хадзіць — бегаць стаў. Але загадчыц клуба «Спатканне» — Элу Іванаўну Бурачкову і Зінаіду Васільеўну Семашкевіч — такія перамены не здзіўляюць. Адпрацаваўшы ў клубе знаёмстваў шэсць гадоў, яны добра ведаюць, на што здольнае каханне.

А пачалося ўсё з жаночых токшоу. Пайшоўшы на пенсію, Эла Іванаўна стала глядзець тэлевізійныя перадачы, на якія раней не хапала часу. Яна бачыла, як часам удзел у іх станавіўся для жанчын першым крокам у новае жыццё, і думала аб тым, што было б няблага арганізаваць нешта падобнае ў сваім горадзе. Яе знаёмая па працы Зінаіда Васільеўна (дарэчы, абедзве жанчыны — былыя эканамісты) падтрымала задумку. Спадабалася яна і былой загадчыцы гарадскога аддзела культуры Надзеі Сідарэнцы, якая дапамагла «прапісацца» клубу ў гарадскім Палацы культуры.

Каб на свае вочы пабачыць, як працуюць такія ўстановы, жанчыны «партызанамі» паехалі ў клуб знаёмстваў у Мінск, зрабіўшы выгляд, што самі шукаюць спадарожнікаў. Але ім там не спадабалася: надта ўсё нагадвала краму — «Паглядзіце каталог!», «Звярніце ўвагу на Івана Іванавіча: у яго вышэйшая адукацыя!», «Не падабаецца? Тады рэкамендую вам Міхаіла Антонавіча...» Эла Іванаўна і Зінаіда Васільеўна вырашылі, што ў іх усё будзе больш інтэлігентна — з танцамі, сумеснымі паездкамі і заняткамі з псіхолагам.

І вось, вызначыўшыся з праграмай, яны далі аб'яву ў мясцовую газету і сталі чакаць наведвальнікаў. Цэлы тыдзень ніхто не прыходзіў. А потым у іх дзверы нясмела пастукала жанчына перадпенсійнага ўзросту. А за ёй натоўпам пайшлі мужчыны: яны часта разам з сябрамі прыходзяць, ім так смялей. І пачалася работа.

Сёння ў «Спатканні» 160 чалавек — гэта болей, чым у любым гуртку Палаца культуры. Для таго каб уступіць у клуб, трэба выканаць тры пункты: запоўніць анкету, якую адразу падшыюць у каталог (усяго каталогаў чатыры — два мужчынскія і два жаночыя), заплаціць 20 тысяч узнос і, безумоўна, мець вялікае жаданне наладзіць сваё сямейнае жыццё. Што датычыцца грошай, то спачатку планавалася збіраць іх кожны год. Але Эла Іванаўна і Зінаіда Васільеўна палічылі, што адзінокія людзі рэдка могуць пахваліцца вялікім дастаткам. Таму на свае 20 тысяч можна хадзіць на пасяджэнні да той пары, пакуль не знойдзеш сабе пару. Невялікая цана за шчасце і каханне, праўда?

Было толькі некалькі выпадкаў, калі загадчыцы не прымалі ў клуб патэнцыяльных жаніхоў і нявестаў.



**Гаспадыні «Спаткання» аналізуюць каталогі.**

Аднойчы да іх прыйшлі 19-гадовыя юнакі. Паскардзіліся, што не хочуць знаёміцца з дзяўчатамі, якія сядзяць на «брадвеі» з бутэлькай піва, а дзе шукаць іншых — не ведаюць. Падумалі кіраўніцы, і адвялі хлопцаў у гурток бальных танцаў.

Адмовілі ў клубе і дзіўнаму мужчыну, які выставіў да будучай выбранніцы толькі адно патрабаванне — каб яна па знаку Задыяка была Блізнём, і абавязкова чэрвеньскім.

Дарэчы, вельмі цікава назіраць, па якіх крытэрыях людзі выбіраюць сабе пару.

— Я ў клуб уступаць не буду: у вас на фотаздымках усе жанчыны сур'ёзныя! — запрацівіўся 75-гадовы Аляксандр Пятровіч, спартсмен, якому можна даць ад сілы 65.

А калі адна з кіраўніц усё ж такі патэлефанавала яму і запрасіла на танцы, ён адразу ж запытаўся:

— А папаўненне ў клубе ёсць? Тады прыйду!

Пра танцы, якія праводзяцца для клубаўцаў два разы на месяц, можна весці асобную размову.

— Я так люблю назіраць, як нашы жанчыны падымаюцца ў танцавальную залу, — прызнаецца Эла Іванаўна. — Усе прыбраныя, з прычоскамі — такія прыгожыя, быццам іх запрасілі на каралеўскі прыём. Але найбольш прыемна, калі нашы клубаўцы пакідаюць залу з мокрымі ад танцаў спінамі і пытаюцца: «А калі наступны вечар?»

Танцы, паездкі і заняткі з псіхолагам дапамагаюць справіцца з праблемамі ў асабістым жыцці не толькі адзінокім людзям, але і тым, хто знаходзіцца на мяжы разводу са сваёй другой палавінай. Так, у «Спатканне» прыйшоў мужчына, які расказаў, што разыходзіцца з жонкай, што між імі ўжо даўно няма ні кахання, ні ўзаемаразумення. У клуб яго запісалі, і ён не прапускаў ніводнага пасяджэння. А тут аднойчы падыходзіць падчас танцаў да кіраўніка і кажа:

— Я выходжу з клуба: з жонкай сышоўся.

Пэўна, яна даведалася, што на яе мужа звяртаюць увагу іншыя жанчыны, прыраўнавала і вырашыла яго вярнуць. І такі выпадак у гісторыі «Спаткання» не адзіны.

Калі падлічыць усе сем'і, што не распаліся дзякуючы клубу, ці людзей, якія проста сталі жыць разам, атрымалася б значная лічба. Пакуль пар, якія афіцыйна ўзялі шлюб, толькі 12. Але Эла Іванаўна і Зінаіда Васільеўна ганарацца такім вынікам і кажуць:

— Дзе б яны сустрэліся, калі б не ў нас?

Шлюбы — чырвоная старонка ў гісторыі клуба. Але непрыемных момантаў у ёй таксама хапае. «Што за турэмшчыка вы мне сасваталі?» — абураецца кліентка. «Ну што, пазнаёмілі з кім-небудзь майго мужа?» — тэлефануюць былыя жонкі клубаўцаў.

Словам, работа ў жанчын такая, што не пазайздросціш. Паспрабуйце абзваніць перад танцамі 160 чалавек ці расклеіць па ўсім горадзе аб'явы. Але самае цяжкае — прапускаць праз сябе жыццё іншых людзей з усімі праблемамі і складанасцямі.

— Я часам прыходжу дадому, быццам выціснуты лімон, — прызнаецца Эла Іванаўна.

Тым не менш сваю работу жанчыны любяць і вельмі крыўдуюць, калі хто-небудзь пытаецца, ці маюць яны які працэнт з кожнай новай сям'і.

— Галоўная ўзнагарода для нас — шчыры «дзякуй»! — з годнасцю адказваюць жанчыны. — А болей нам нічога не трэба.

**Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота аўтара.**

* Па этычных меркаваннях імёны ўсіх герояў зменены.

♥ Для Наталлі жыццё спынілася, калі пайшоў з жыцця яе 25-гадовы сын, якога яна выхоўвала адна і ў якога ўкладвала ўсю душу. Пяць гадоў жанчына жыла ў апатыі: у яе штодзённым маршруце было толькі два прыпынкі — дом і завод. Наталля стала абыякавай да самой сябе, не кажучы ўжо пра мужчын, пакуль знаёмая не адвяла яе ў «Спатканне»...

* * *

♥ Вайсковец Аляксей быў у клубе далёка не навічком, але за ўвесь час ніводная з жанчын яму так і не спадабалася. «Вазьмі яго нумар, — прапанавала Наталлі загадчыца клуба Зінаіда Васільеўна, — а раптам спадабаешся?» І як у ваду глядзела: сустрэўшыся, Наталля і Аляксей болей не расставаліся. У чэрвені споўнілася роўна чатыры гады, як яны жывуць разам. Наталля з задавальненнем песціць дзетак сына Аляксея і радуецца, што цяпер у яе ёсць унукі.

* * *

♥ Віктар прыехаў у Беларусь з Казахстана. Скарб з сабою меў невялікі: самым каштоўным у ім былі два сыны, якіх ён забраў ад п'яніцы-жонкі. Ён спыніўся ў вёсцы пад Маладзечнам, стаў працаваць лазеншчыкам, атрымаў у сваё распараджэнне домік. Для поўнага шчасця не хапала толькі гаспадыні.

У клубе «Спатканне» адразу звярнуў увагу на ўсмешлівую Насцю. Дзяўчына доўга не магла рашыцца звязаць жыццё з чалавекам з другой краіны, ды яшчэ пры дзецях. Але калі яна прыехала пагасцяваць да Віктара ў вёску, хлапчукі, не згаворваючыся, сталі называць яе мамай — і нерашучасць быццам рукой зняло.

А нядаўна шчаслівая пара была заўважана ў паліклініцы: у сямействе чакаецца папаўненне.

* * *

♥ Сяргей заклапочана гартаў каталог патэнцыяльных нявестаў. «Паглядзіце на нашу Леначку, — засяродзіла яго ўвагу на здымку маладой прыгажуні загадчыца клуба, — падабаецца?» «Нейкая ганарлівая!» — буркнуў мужчына.

Але здарылася так, што менавіта з гэтай «ганарлівай» ён адначасова выйшаў на ганак пасля танцаў. І да ўсяго высветлілася, што ім вяртацца ў адзін раён. З тае пары яны разам і вяртаюцца, але не толькі на адну вуліцу — у адну кватэру.

## СТАРЫЯ ПАВЕРЫЛІ ПРАЙДЗІСВЕТАМ...

**Два вельмі падобныя крадзяжы, ахвярамі якіх сталі бабулькі, а злачынцы дзейнічалі «пад псеўданімамі» зафіксаваны ў чарговы раз у Мінску.**

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, у адным выпадку пацярпела 86-гадовая старая. Гаспадыня ўпусціла ў жыллё двух незнаёмцаў, якія адрэкамендаваліся ёй медыцынскімі работнікамі. Калі ж «медыкі» сышлі, пенсіянерка ўбачыла, што разам з імі з кватэры зніклі 1 тысяча долараў ЗША і 1 мільён беларускіх рублёў. Да другой бабулькі, якой 81 год, двое невядомых завіталі днём, нібыта як супрацоўнікі Мінгазу. Пакруціўшыся ў старой з паўгадзіны, злачынны «дуэт» знік. Невядомыя забралі 1 мільён рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПРЫПЫНІЛІ «РЫБНЫЯ ДНІ»

**Больш за 220 кілаграмаў скрадзенай за два дні рыбы вярнулі дзяржінспектары Любанскай міжрайінспекцыі рыбакамбінату «Любань».**

У першы дзень больш чым 140 кілаграмамі рыбы з сажалак гаспадаркі «затаварыліся» два вадзіцелі прыватнага ўнітарнага прадпрыемства са Старых Дарог. На другі дзень больш за 80 кілаграмаў рыбы было канфіскавана ў непрацуючага грамадзяніна. Цяпер у дачыненні да парушальнікаў разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Рэха публікацыі

# «КАБ РАБОТНІКІ МОГІЛКАЎ НЕ НАЖЫВАЛІСЯ НА ЧУЖЫМ ГОРЫ», *(22.08.2008)*

«Павялічылася колькасць выпадкаў атрымання (як правіла, шляхам вымагання) работнікамі могілак хабару і прыняцця незаконных узнагароджанняў у аказанні паслуг па пахаванні і перапахаванні грамадзян. Такія факты зафіксаваны ў Першамайскім раёне Віцебска, Рэчыцы, Цэнтральным раёне сталіцы...»

— Так, сапраўды, крыху больш як два гады таму супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі загадчыка і наглядчыка могілак «Паўночныя, — пацвердзіў **генеральны дырэктар ДВА «Камунальная гаспадарка Мінгарвыканкама» Мікалай ДРЭМУК.** — Напярэдадні арышту яны атрымалі ад грамадзянкі М. матэрыяльнае ўзнагароджанне ў памеры 2000 долараў за вырашэнне пытання аб перапахаванні яе бацькі, пахаванага ў Смаленску, да магілы маці, якая пахавана на могілках «Паўночныя». Па гэтым выпадку ўзбуджана крымінальная справа. Суд Цэнтральнага раёна сталіцы прыгаварыў загадчыка могілак да чатырох гадоў пазбаўлення волі, наглядчыка — да трох гадоў пазбаўлення волі. Акрамя таго, былы загадчык могілак пазбаўлены права займаць пасады, звязаныя з ажыццяўленнем адміністрацыйна-гаспадарчых і арганізацыйна-распарадчых функцый, тэрмінам на пяць гадоў. У перыяд з 2006 года па сёння фактаў злоўжывання больш не выяўлена.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пахаванні і пахавальнай справе», арганізацыяй пахавальных мерапрыемстваў займаюцца спецыялізаваныя арганізацыі, створаныя мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. У Мінску паслугі такога кшталту аказвае камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Спецыялізаваны камбінат камунальна-бытавога абслугоўвання».

Паводле слоў Мікалая Дрэмука, планіроўка месцаў для пахавання, парадак адводу і рэзервавання зямельных надзелаў для пахавання на тэрыторыі могілак, served перазахавання, вядзенне ўліку пахаванняў, разбіўка надзелаў для пахаванняў КУП «Спецкамбінат КБА» вядзецца ў адпаведнасці з Правіламі ўтрымання месцаў пахавання. Гэта значыць, што тэрыторыя месца для пахаванняў падзелена на сектары (надзелы) пахаванняў, якія разбіты на рады для магіл. Сектары (надзелы), рады і магілы пранумараваныя. Пахаванні праводзяцца паслядоўна ў кожным радзе, спачатку на адным надзеле, а затым на другім. Кожны зямельны надзел для пахавання мае асабісты ўліковы нумар.

Сёння памер бясплатнага надзелу для пахавання ўстанаўліваецца такім чынам, каб гарантаваць пахаванне на гэтым надзеле ў далейшым блізкага родзіча памерлага і складае 2,3 метра ў даўжыню і 2 метры ў шырыню. Для адзіночнага пахавання памер надзелу мае 2,3 метра ў даўжыню і 1,4 метра ў шырыню. На тэрыторыі месцаў пахавання могуць ствараецца і сямейныя надзелы. На іх дазваляецца рэзерваванне надзелаў для пахавання звыш бясплатна прадастаўленага надзелу. Памер аплаты за надзелы на тры-чатыры месцы ўстаноўлены рашэннем Мінгарвыканкама.

На старых могілках, дзе маецца магчымасць дазволіць дадатковае рэзерваванне надзелаў, існуе свой парадак дакупкі. Спачатку грамадзянін звяртаецца з заявай, якая ў абавязковым парадку разглядаецца камісіяй з выездам на могілкі і правядзеннем інструментальных замераў. У выпадку станоўчага заключэння камісіі афармляюцца дакументы на аплату і ўносяцца адпаведныя змяненні ў дакументацыю. Гэта дазваляе пазбегнуць злоўжыванняў на могілках.

**Надзея ДРЫЛА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже в собственность земельных участков для индивидуального жилищного строительства**

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|---|
| Наименование объекта | Земельный участок | Земельный участок | Земельный участок | Земельный участок |
| Местонахождение объекта | Сморгонский район, Кореневский с/с, д. Корени У-41А | Сморгонский район, Кореневский с/с, д. Корени У-41В | Сморгонский район, Кореневский с/с, д. Корени У-41Б | Сморгонский район, д. Вишнево, ул. Парковая, У-2 |
| Кадастровый номер | 425682403101000123 | 425682403101000125 | 425682403101000124 | 425680802601000181 |
| Площадь участка (га) | 0,2424 | 0,2399 | 0,2438 | 0,1979 |
| Форма проводимого аукциона | Аукцион с условием | | | |
| Срок аренды | Продажа в собственность | | | |
| Условия продажи | Строительство и обслуживание жилого дома в течение 3-х лет с момента принятия решения райисполкома о передаче участка в частную собственность | | | |
| Начальная цена (руб.) | 659817 | 653006 | 663624 | 192078 |
| Сумма задатка (руб.) | 65980 | 65300 | 66360 | 19210 |
| Расходы, связанные с организацией, проведением аукциона и подготовкой документации (руб.) | 539482 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) | 539482 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) | 539482 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) | 527200 (кроме того, расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ) |

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:**

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в частную собственность;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/сч 3602526000007 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 504, УНП 500108330, код платежа 5520, получатель платежа – финансовый отдел Сморгонского райисполкома.

**Гражданин** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

Индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

**Юридическое лицо** – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о гос. регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомится с объектами.

**Аукцион состоится 11 ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5 в малом зале заседаний.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, каб. 302 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Телефоны для справок в г. Сморгони: **8 01592 3 23 41, 3 17 23, 3 23 91.**

Заявления принимаются по **5 октября 2008 года** до 17.30 включительно.

# «АРЫШТУЙЦЕ! ЁН ВЫКІНУЎ МАЙГО ХАМЯЧКА НА ДОЖДЖ!»

## або Кур'ёзныя звароты ў паліцыю і да выратавальнікаў

Zамор'е

**Служба выратавання для таго і існуе, каб у яе тэлефанавалі з крыкамі «Ратуйце! Дапамажыце!». Прыкладна з тым жа самым тэлефануюць і ў паліцыю. І, так ужо заведзена, нумары гэтых службаў вядомыя не толькі разумным грамадзянам, але і тым, якія не ўваходзяць у іх лік. А таму сярод званкоў здараюцца і такія...**

Хатняя гаспадыня з Германіі звярнулася ў паліцыю і паскардзілася на сяброўку, якая гутарыла з ёй па тэлефоне 30 гадзін без перапынку. Як расказала паліцыі 48-гадовая немка Інгрыд Шэтлер, яна патэлефанавала сяброўцы, каб запрасіць яе «пабалбатаць і выпіць кубачак гарбаты». Аднак сяброўка, зняўшы трубку і пачаўшы гутарку, не змагла спыніцца і прабалбатала па тэлефоне ўсю ноч і ўвесь наступны дзень. Толькі афіцэры паліцыі змаглі прымусіць яе супакоіцца. Па словах прадстаўніка паліцыі, «пасля 30 гадзін бесперапыннай балбатні па тэлефоне і некалькіх няўдалых спробаў «развітацца» з суразмоўцай, жанчына не бачыла іншага выйсця, акрамя як патэлефанаваць нам». Між тым, кожная служба выратавання ў любой краіне свету сутыкаецца з падобнымі кур'ёзнымі зваротамі, у пачатку гэтага года паліцыя Паўднёвага Уэльса ў Вялікабрытаніі нават апублікавала самыя недарэчныя просьбы аб дапамозе.

### «ХУТКАЯ»? ХУТЧЭЙ — Я ЗЛАМАЛА ПАЗНОГАЦЬ!

Як высветлілася, кожны дзясяты званок у брытанскую паліцыю ў Паўднёвым Уэльсе — альбо зварот «не па адрасе», альбо наўмыснае злоўжыванне сістэмай экстраннай дапамогі. Напрыклад, адна жанчына патэлефанавала, таму што ў яе не было манеты ў 1 фунт, каб узяць каляску ў супермаркеце. Другая брытанка патрабавала дапамагчы ёй знайсці яе акуляры.

Яшчэ адзін мужчына патэлефанаваў у паліцыю, каб яна прыехала і выгнала яго цешчу, якая жыла ў яго ў доме ўжо 18 дзён. Жанчына патэлефанавала ў паліцыю і паскардзілася на свайго бойфрэнда, які не аддаваў ёй пульт ад тэлевізара, а яна вельмі хацела паглядзець папулярны тэлесерыял.



А служба выратавання аднаго з гарадоў на захадзе Англіі атрымала выклік ад брытанца, разлаванага тым, што яго жонка, замест таго каб гатаваць яму вячэру, займалася сваёй знешнасцю. Ён заявіў: «Яна пакінула мне два бутэрброды з ласосем, якія засталіся яшчэ з мінулай вячэры», — і запатрабаваў дапамогі ў афіцэраў. «Я тут сяджу, а яна дзесьці фарбуецца і не збіраецца падаваць мне вячэру!» — дадаў ён.

А паліцыя нямецкага горада Ахен прыняла выклік ад 44-гадовай жанчыны, якая паскардзілася на свайго мужа за тое, што той не выконвае сваіх шлюбных абавязкаў. Яна больш не змагла цярпець гэтую сітуацыю і пасярод ночы разбудзіла свайго 45-гадовага мужа, запатрабаваўшы ад яго задавальнення жаданняў. Атрымаўшы адмову, прыняла рашэнне патэлефанаваць паліцэйскім, але тыя, вядома, не змаглі нічым дапамагчы.

Сярод недарэчных зваротаў у амерыканскую службу выратавання — званок жанчыны, якая выклікала «хуткую» прама з начнога клуба, пасля таго як зламала пазногаць. Другая патэлефанавала ў «911» з-за таго, што мыш праглынула яе лекі. Адзін амерыканец папрасіў дапамогі ў... пераключэнні тэлевізара на другі канал, другі спалохаўся начнога кашмару, у якім ён быў без прытомнасці і ў поўнай знямозе, а трэцяму тэрмінова спатрэбіўся поп-корн.

Нядаўна паліцыя таго ж Паўднёвага Уэльса прыбыла па тэрміновым выкліку аднаго з мясцовых жыхароў, які паведаміў аб «яркім нерухомым аб'екце» ў паветры над гарой. Мужчына паведаміў, што аб'ект «быў там паўгадзіны таму, і ён усё яшчэ там» і папрасіў высветліць, што гэта такое. Паліцыя, якая прыехала на месца, знайшла ў небе Месяц.

### ЧАМУ НЕ БРЭША «ПАРОДЗІСТЫ КАРЛІКАВЫ ПУДЗЕЛЬ»?

Распаўсюджанай прычынай званкоў з'яўляюцца хатнія гадаванцы. Так, адна дзяўчына з Вялікабрытаніі прасіла арыштаваць яе маладога чалавека, таму што ён выставіў яе хамячка пад дождж. Другая звярталася па дапамогу, таму што ў яе ў хаце было кацяня і яна «не ведала, што з ім рабіць». Тысячы японскіх жанчын аднойчы былі падманутыя ашуканцамі, якія прадалі ім «пародзістых карлікавых пудзеляў», якія насамрэч аказаліся звычайнымі авечкамі. Жанчыны не адразу вызначалі, што іх сабакі зусім не падобныя на саміх сябе. Так, кіназорка Суколка Кавакамі, якая таксама стала ахвярай ашуканцаў, паскардзілася на адным з ток-шоў, што яе новы пудзель зусім не брэша і адмаўляецца есці сабачы корм. Затым жанчына дастала фатаграфію свайго гадаванца і паказала прысутным у зале. Якое ж было яе здзіўленне, калі гледачы сталі запэўніваць, што гэта звычайнае ягня. Адна сямейная пара выявіла, што ў іх замест сабакі жыве авечка толькі ў час паходу да стыліста для хатніх жывёл. Спецыяліст сказаў, што не можа адрэзаць гадаванцу кіпцюры, таму што ў яго замест іх — капыты.

### ДУР НАЙШЛА

У паліцэйскім аддзяленні горада Адэлаіда штата Паўднёвая Аўстралія ў красавіку гэтага года раздаўся званок ад мужчыны, які расказаў, што ў яго кватэру ўварваліся праз акно шасцёра рабаўнікоў, якія выкралі ў яго некалькі вазонаў з канаплямі. Зладзеяў вартавыя парадку так і не знайшлі, затое 30-гадовага жыхара арыштавалі. А летась у штаце Тэхас нелегальны імігрант з Мексікі звярнуўся ў паліцыю з заявай, што два ўзброеныя чалавекі выкралі ў яго 70 кілаграмаў марыхуаны. Пацярпелы таксама быў арыштаваны. А ў лютым 2006 года ў паліцыю нямецкага горада Дармштат звярнуўся курэц марыхуаны, які абвінавачіў свайго дылера ў махлярстве. У сваім іску 52-гадовы Ханс-Ёрган Бент заявіў, што дылер прадаў яму 200 грамаў «дуры, якая цалкам не ўстаўляе».

Падобны выпадак быў зафіксаваны і ў амерыканскім штаце Джорджыя. 53-гадовая жанчына выклікала вартавых парадку, каб паскардзіцца на гераін, які яна купіла ў наркагандляра. Калі паліцэйскія прыбылі, жанчына правяла іх да сабе на кухню, паказала наркотыкі і запатрабавала пакараць нядобрасумленнага дылера. Аднак цяпер жыхарка штатаў сама будзе адказваць па ўсёй строгасці закона за захоўванне наркотыкаў.

### НУДА ЗАЕЛА

Адзінокі пенсіянер з Германіі «даставаў» паліцыю два дні запар, у агульнай складанасці ён патэлефанаваў ім больш за 200 разоў. Падставай для звароту стала нуда. Справа ў тым, што хатні тэлефон 62-гадовага мужчыны быў заблакаваны за няплату, і адзіным нумарам, які можна было набраць і пачуць адказ, аказаўся экстранны выклік паліцыі. Калі цярпенне вартавых парадку лопнула і да мужчыны быў адпраўлены нарад, немец затаіўся і дзверы ім не адчыніў, пасля чаго набраў запаветны нумар яшчэ каля трыццаці разоў. Званкі спыніліся толькі пасля таго, як тэлефонныя рахункі пенсіянера былі аплачаныя.

Пасля такіх выпадкаў паліцыя ўсіх краін растлумачвае людзям, што не варта тэлефанаваць па тэлефонах экстранных службаў без лішняй патрэбы — толькі калі здзяйсняецца злачынства, мае месца гвалт або адбылася аварыя, у выніку якой ёсць пацярпелыя. У Паўднёвым Уэльсе для адсявання «лжывых званкоў» нават было зменена традыцыйнае прывітанне «Чым я магу вам дапамагчы?» на «Што ў вас адбылося?».

**Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**

### ВЫРАТАВАЛІ АД АГНЮ...

**Каля паловы пятай дня ў Рагачове выратавальнікі тэрмінова выехалі на пажар, паведамленне аб якім паступіла з вуліцы Ніжагародскай.**

Паводле інфармацыі прэс-сакратара Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслана Габрылёва, агонь лютаваў у цаглянай летняй кухні. З палаючага збудавання вывелі 53-гадовага сына гаспадыні дома і яго 44-гадовую сяброўку. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай пажару стала неасцярожнасць пры курэнні ў нецвярозым стане.

**Ігар ГРЫШЫН.**




# РЭГІСТРАЦЫЯ Ў ІНТЭРНАЦЕ

***Жыву ў інтэрнаце. Нядаўна выйшла замуж і звярнулася да адміністрацыі з просьбай зарэгістраваць мужа па месцы майго жыхарства, але мне адмовілі. Ці правільна гэта?***

**Ганна Р.,** *г. Гомель*

Згодна з Палажэннем аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.09.2007 г. № 413, адказнымі за рэгістрацыю грамадзян у інтэрнаце з'яўляюцца кіраўнікі арганізацый, ва ўласнасці альбо ў гаспадарчым распараджэнні ці аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца гэтыя інтэрнаты. Заява аб рэгістрацыі падаецца ім. Падставай для рэгістрацыі з'яўляецца дагавор найму жылога памяшкання ў інтэрнаце.

Палажэннем аб рэгістрацыі грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання (пункт 8) рэгістрацыя грамадзян па месцы жыхарства ў інтэрнаце абмяжоўваецца, калі пасля такой рэгістрацыі забяспечанасць жылой плошчай на аднаго чалавека складзе менш як 6 квадратных метраў на аднаго чалавека. Але згодна з пунктам 9 гэтага Палажэння, указанае абмежаванне не распаўсюджваецца на выпадак рэгістрацыі мужа (жонкі) па месцы жыхарства жонкі (мужа).

Пры прыняцці рашэння аб заключэнні дагавора найму жылога памяшкання ў інтэрнаце, які з'яўляецца падставай для рэгістрацыі грамадзяніна па месцы жыхарства, адміністрацыя арганізацыі кіруецца дзеючымі ў гэтай вобласці нарматыўнымі прававымі актамі. Як устаноўлена пунктам 84 Палажэння, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.11.2005 г. № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносінаў», парадак прадастаўлення жылых памяшканняў (іх частак) у інтэрнаце і карыстання імі, заключэння дагавора найму жылога памяшкання ў інтэрнаце вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Палажэннем аб інтэрнатах, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15.09.1999 г. № 1437 са змяненнямі і дапаўненнямі на 20.08.2008 г., прадугледжана, што інтэрнаты ёсць двух тыпаў: прызначаныя для пражывання адзінокіх грамадзян, у якіх жылыя памяшканні знаходзяцца ў сумесным карыстанні некалькіх асобаў, якія не знаходзяцца ў сямейных адносінах, і прызначаныя для пражывання сем'яў, у якіх жылыя памяшканні, што складаюцца з аднаго ці некалькіх пакояў, знаходзяцца ў адасобленым карыстанні сем'яў. У інтэрнатах для адзінокіх грамадзян могуць пры неабходнасці выдзяляцца жылыя памяшканні для пражывання сем'яў на асобных паверхах ці ў асобных секцыях са згоды мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Пунктам 34 Палажэння аб інтэрнатах устаноўлена, што грамадзяне, якія займаюць ізаляваныя жылыя памяшканні, прызначаныя для пражывання сем'яў, маюць права ўсяляць у іх сваіх няпоўнагадовых дзяцей і мужа (жонку), не забяспечаных жыллём у дадзеным населеным пункце па норме.

Калі ж вы займаеце месца ў памяшканні, прызначаным для пражывання адзінокіх грамадзян, то сітуацыя тут некалькі іншая. Як устаноўлена пунктам 8 вышэйназванага Палажэння, грамадзяне, якія пражываюць у інтэрнатах, прызначаных для пражывання адзінокіх грамадзян, у выпадку стварэння сям'і ва ўстаноўленым парадку становяцца на ўлік маючых патрэбу ў атрыманні жылога памяшкання ў інтэрнаце, які прызначаны для пражывання сем'яў.

Хто каго?

# «ІКЕБАНІЦЬ — ДЫК З РАЗМАХАМ!..»



**...Ну калі ж яшчэ сябе пахваліць, як не ў канцы чарговай падпіснай кампаніі?! Не, не лічбамі. Яны, як любяць казаць бюракраты (з якімі мы даўно і досыць беспаспяхова змагаемся), вымушаюць чакаць лепшага. Мы — словамі. Прычым для нас — вельмі дарагімі. Кшталту: «Дзень добры, шаноўная (гэта, значыць, ну вельмі паважаная) рэдакцыя! — піша Яўгенія Станіславаўна Янковіч з в. Гарадзішча Докшыцкага раёна. — Шчыры дзякуй табе за цікавую газету. Летась я была выпісала другую і вельмі пашкадавала, бо ўсё ў ёй нейкае не тое, чужое. А тут — маё. Чытаю, чакаю баек і апавяданняў, люблю сканворды, бо хочацца «паварушыць мазгамі», і здымкі Клешчука. А ўжо подпісы да іх — гэта наогул штосьці!..»**

Амаль тое ж у другім лісце — ад Валянціны Апанасаўны Гудачковай з Жыткавічаў: «Пяты год выпісваю «Звязду» і ўсё шкадую, ну чаму не раней! Бо пра ўсё ж тут — ад таго, што робіцца ў свеце, да таго, што ў асобнай душы... Чытаю... Люблю разглядваць здымкі, і часта яны гавораць мне болей, чым цэлыя апавяданні. А ўжо ў апошні час —

*Прыжыўся Кляшчук*
*у Давыд-Гарадку:*
*Здымаў дзіва-хаты і дзіва-раку,*
*Харошых людзей і харошых*
*іх дзетак*
*За шчыраю працай,*
*у водары кветак...*
*За што Клешчуку — вельмі*
*ўдзячная я:*
*Той кветкавы горад —*
*радзімка мая...*
*Хоць, зрэшты, да кветак —*
*паўсюдна ахвота:*
*Растуць і красуюць, бач,*
*нават у ботах...*

Так перайшла да тэмы Валянціна Апанасаўна.

Што прапанавала ў якасці подпісу? Чатыры радкі:

*А хоць плач ты, хоць спявай,*
*Мода вінаватая!*
*Аддаў боты на дызайн*
*І чорт з імі, з пятамі!*

У сэнсе (трэба так разумець?) халера іх не возьме — хай (свят-свят-свят!) памокнуць, хай памерзнуць! Чалавеку гэтаму іншае важней! Яго, відаць, яшчэ прадзеды навучылі — хоць салому еш, а фасону не губляй. Вось ён са скуры і вылузваецца. Па-нашаму думае, па-тутэйшаму (думкі яго прачытаў спадар Барысёнак з Ушаччыны):

*Ікебаніць — дык з размахам!*
*Нам японцы — не ўказ.*
*Мы, калі захочам свята,*
*Свята зробім — першы клас!*

Хто б сумняваўся, гледзячы на конкурсны здымак ці ў тэлевізар — пасля тых жа дажынак...

Але ж людзі такія ёсць. Сцяпан Паўлавіч Нефідовіч мо ў сваёй вёсцы Любань Лунінецкага раёна, мо ў іншай якой вось такі дыялог падслухаў:

*— А што ж гэта за прычына,*
*Што разлёгся так мужчына?*
*— Дык дажынкі сёння ў нас, —*
*Ляжыць покатам калгас.*

«Яшчэ б нічога, — прозай дадае Сцяпан Паўлавіч, — каб пілі мы толькі ў святы, а то ж і ў будні... Мо ад безвыходнасці — ну што тыя 150-170 тысяч рублёў у месяц?!»

Вось паводле яго меркавання мужык са здымка і рашыў:

*Па 5 тысяч платы ў дзень —*
*Не нясуць на працу боты.*
*Лепш павешу іх у цень —*
*Паратункам ад нудоты.*

Для некага, як прызнае спадарыня Чыгрынава з в. Забалацце Вілейкага раёна, гэта і насамрэч пацешна, бо

*Не кітайскі фарфор*
*Упрыгожыў той двор...*
*Але ж гэтакую «вазу»*
*Кожны ўбачыць... І адразу —*

Вось тут можна паспрачацца, бо нехта бачыць яе, вось такую незвычайную, а нехта (ацаніце!) —

*Ходзіць вёска не ў абносках,*
*Выйшла вёска ў інтэрнэт:*
*Адкрываць пара ў вёсцы*
*Педыкюрны кабінет!*

Лічыць так Міхаіл Паўлавіч Дубовік з Бярэзіншчыны. Не ўдакладняе, праўда, у сваёй вёсцы Арэшкавічы ці ў нейкай іншай, але ж, адназначна, у прасунутай.

Хоць і там не без праблем. Прычым вельмі балючых:

*За ім, лысым, крывапятым*
*Гужам бегаюць дзяўчаты,*
*Бо адзіны ён «хадок»*
*На ўвесь аграгарадок:*
*Той дасць кветачак з бахілаў,*
*Той — бутэлечку «чарнілак»,*
*З той патанчыць,*
*з той пакурыць...*
*І, вядома, усіх абдурыць,*
*Бо сягодня дужа ж модна*
*У каханні быць свабодным...*
*І няма чамусьці «пугі»*

*Для такога вось спрытнюгі!* — шкадуе Уладзімір Сітнік са Старадарожчыны (не ўлажыўшыся, на жаль, у восем радкоў) — шкадуе, відаць, тых «абдураных» жанчын і дзяўчат. І нават у думках не мае, што сёння яны і самі, каго хочаш абдураць. Пра што досыць складна піша Соф'я Парфір'еўна Кусянкова з Рагачоўшчыны (прызнаецца: «Сказ пра Лысую гару» прачытала, — рыфмы самі «папёрлі»):

*Глянь, які букет сабраў*
*Для сваёй каханкі!*
*А яе, як чорт забраў, —*
*Не прыйшла да ранку!..*
*Больш чакаць ужо не змог,*
*Слёзы ціха выцер,*
*Каля ганку ў яе лёг,*
*Лёг — і ногі выцяг...*

Вось такая «трагедзь» на здымку. А некаму — адны жартачкі бачацца. Зрэшты, Яўген Васільеў з п. Сасновы Асіповіцкага раёна таксама туды ж. Піша (спачатку прозай): «Мара кожнага беларуса — кавалачак зямелькі, каб прыкласці рукі, каб атрымаць задавальненне ад зробленага, ад агурочка ці памідорчыка, вырашчанага на сваёй градцы. А ўжо верх асалоды — іх з'еўшы, легчы дзесь у цяньку і падсумаваць:

*Хоць чатыры, але ж «соткі» —*
*Усё ў ажуры, ёсць і толк.*
*Што лічыць здароўе, сродкі...*
*Ён зрабіў усё, што змог».*

Але ж, трэба разумець, словы гэтыя не з хаўтурных прамоў — жывы чалавеча?! Проста

*Адпачыць улёгся Фёдар...*
*Мы — дзівіцца, што за водар?*
*Гэта ў ботах з Турцыі*
*Выраслі настурцыі! —*

лічыць Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна.

«Не слаба», значыць, мужык адпачывае — як мінімум з вясны. І пры гэтым ніхто яго не «пілуе», не падымае, ніхто ні ў чым не папракае. Чаму? Бо хітры, лічыць Вольга Паўлаўна Лабажэвіч з Клецка:

*Вось гэтак у цешчы*
*«укалвае» зяць*
*Ён працы не любіць,*
*Ён любіць узяць...*
*Аднак да жанчын*
*Ён знайшоў падыход —*
*Па кветкі схадзіў*
*У чужы агарод, —*

Мусіць, і праўда гэта, бо букетаў, бачыце, два: адзін — для жонкі, другі — для цешчы. А жыццё ў мужыка адно. І здароўе — адно. Берагчы яго трэба. Што мужык, паводле меркавання спадарыні Васільевай з Гомеля, і робіць: дамоў ідзе і сам сабе прыгаворвае:

*Мае ногі босыя,*
*Хай не будзе зносу вам!*
*Пасля цяжкае работы*
*З вас адразу ж скіну боты*
*У балеі спаласну*
*І да сонца падыму...*
*Вас я, ногі, больш шкадую,*
*Чымсці галаву дурную.*

Што ж — хто што... Хто ўсё... Але шкадаваць, згадзіцеся, трэба — павучальны здымак. Чаму ён вучыць яшчэ? Рознаму. Ад элементарнага

*Як прыходзіце з работы,*
*То хутчэй сушыце боты*
*І у іх — стаўляйце кветкі,*
*Каб не несла потам едкім*

(ад Яўгеніі Станіславаўны Янковіч), да высокага (ад Зоі Пятроўны Янучок з Клеччыны):

*Змарыла сонейка хлапчыну,*
*Прылёг паспаць ён на адрыну.*
*Дзяўчына, мабыць, тут была —*
*Настурка ў ботах расцвіла...*
*А Ясь — праспаў яе візіт.*
*Ці ж гэта хлопец? Паразіт!*

Што пасярэдзінцы? Самі вы ніколі б не здагадаліся, а ў газеце прачытаць можна:

*І навошта нам той Крым?*
*Мы і дома загарым:*
*Тут, пад Слуцкам, нашы пяткі*
*Стануць нібы шакаладкі! —*

сцвярджае Уладзімір Сітнік. Пра іх жа, пра перавагі тутэйшага адпачынку, радкі спадара Дубовіка:

*Мужыкі, нашто нам Гагры?*
*Там жа трэба шмат віягры...*
*Тут працую... Мо й стамлюся...*
*А на сонцы адляжуся, —*
*Раніцой (казаць няёмка)*
*Пацалуе мяне жонка.*

Вось так.

Што на завяршэнне? Гімн. Ад таго ж Міхаіла Паўлавіча Дубовіка:

*Боты вы гумовыя,*
*Хадакі вясковыя!*
*Мала — кветак вам нарваць,*
*Вам бы помнік збудаваць,*
*Бо калі падумаць трохі,*
*З вамі цэлая эпоха!*

Хто б спрачаўся?.. Больш за тое — можа гэта... праект?

І яшчэ чатыры радочкі — чыста восеньскія:

*Стане ніжэй сонца,*
*Адцвітуць настуркі,*
*Улезем мы ў боты,*
*Улезем мы і ў буркі.*

Хай Бог дае... Каб улезлі, каб вылезлі, каб жылі. І каб (вашымі стараннямі) жыў наш конкурс. Вельмі хочацца спадзявацца, што на чарговым этапе да яго зноў далучацца новыя ўдзельнікі і, завяршыўшы сельскагаспадарчы сезон, вернуцца «старыя» — з Сенненшчыны, Бярэзіншчыны, Пастаўшчыны, з Кіраўска, Шчучына, Вілейкі... Бо весялосць, як пісаў наш зямляк Фёдар Дастаеўскі, самая выдатная рыса: добра смяецца чалавек, значыць, чалавек — добры. Чым-чым, а дабрынёй сёння трэба дзяліцца.

І таму... Лепшыя подпісы да папярэдняга здымка (з курыцай у будцы і сабакам), паводле меркавання вялікага чытацкага журы, даслалі спадары Барысёнак з Ушаччыны, Сітнік са Старадарожчыны, Васільеў з Асіповіччыны, спадарыня Фетчанка з Лагойшчыны і... мінчане Астроўскія. З чым (амаль аднадушна) пагадзілася і журы рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на любімую газету на 1 квартал 2009 года застаецца ў сталіцы. Хочаце, каб прыйшоў да вас? Здымак дадаецца — глядзіце, думайце, пішыце, закрэслівайце, зноў думайце, зноў пішыце і ўжо гатовыя варыянты дасылайце ў рэдакцыю. Патрабаванні ранейшыя: у варыянце — не больш за 8 радкоў, пажадана прыгожых, трапных і (калі ласка!) разборлівых.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**






БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» г. Минск

## Правила проведения «70-го тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях»

*(выписка из Правил приема и совершения операций по выигрышным вкладам в белорусских рублях, утвержденных Правлением банка 27.09.2001 (протокол № 38.6) по состоянию на 08.09.2008)*

1. Организатором проведения рекламной игры «70-й тираж выигрышей по выигрышным вкладам в белорусским рублях» является Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – ОАО «АСБ Беларусбанк», «Организатор»), УНП 100325912; адрес: г. Минск, 220050, ул. Мясникова, 32.

Свидетельство о регистрации банка выдано 27 октября 1995 года № 56 Национальным банком Республики Беларусь.

2. «70 тираж выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях» проводится на территории Республики Беларусь.

3. Срок начала и окончания рекламной игры: 09.10.2008.

4. Розыгрыш призового фонда 70-го тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях проводится 09.10.2008 в 12.00 в здании филиала № 527 ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, 7-а.

5. Размер призового фонда составляет: 180 000 000 (Сто восемьдесят миллионов) белорусских рублей.

Призовой фонд сформирован из чистой прибыли организатора.

6. Тираж выигрышей по выигрышным вкладам, хранящимся в учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк» проводится централизованно для всех учреждений банка. Тираж выигрышей проводится открыто. День, время и место проведения тиража устанавливается с таким расчетом, чтобы граждане могли присутствовать на тираже. В этих целях проводится информация населения о предстоящем тираже в средствах массовой информации.

7. Для проведения тиража приказом Председателя Правления ОАО «АСБ Беларусбанк» утверждается комиссия. В состав комиссии по проведению тиража выигрышей включаются Председатель комиссии, его заместитель, ответственный секретарь и 5 членов комиссии. Председателем комиссии назначается представитель исполнительного комитета по месту проведения тиража. Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры «70 тираж выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях» – один день (09.10.2008).

8. В тираже участвуют выигрышные вклады, действующие по состоянию на 1 октября 2008 года.

Вклады, закрытые в период с 1 апреля 2008 года до 1 октября 2008 года в тираже не участвуют.

9. При проведении тиража на каждую 1000 номеров счетов разыгрываются 25 выигрышей:

- 1 выигрыш – 900 процентов среднего остатка вклада за истекшее полугодие по счету, на который выпал выигрыш;
- 2 выигрыша – 450 процентов среднего остатка вклада за истекшее полугодие;
- 2 выигрыша – 225 процентов среднего остатка вклада за истекшее полугодие;
- 20 выигрышей – 112 процентов среднего остатка вклада за истекшее полугодие.

10. Выигрыши в тиражах по выигрышным вкладам разыгрываются по группам, каждая из которых состоит из последовательных 40 номеров по выигрышным вкладам.

В каждой группе выигрывает один номер счета.

В группы входят следующие номера счетов:

в 1-ю группу – номера счетов с № 1 по 39 включительно, а также № 1000;
во 2-ю группу – с № 40 по 79 включительно;
в 3-ю группу – с № 80 по 119 включительно;
в 4-ю группу – с № 120 по 159 включительно;
в 5-ю группу – с № 160 по 199 включительно;
в 6-ю группу – с № 200 по 239 включительно;
в 7-ю группу – с № 240 по 279 включительно;
в 8-ю группу – с № 280 по 319 включительно;
в 9-ю группу – с № 320 по 359 включительно;
в 10-ю группу – с № 360 по 399 включительно;
в 11-ю группу – с № 400 по 439 включительно;
в 12-ю группу – с № 440 по 479 включительно;
в 13-ю группу – с № 480 по 519 включительно;
в 14-ю группу – с № 520 по 559 включительно;
в 15-ю группу – с № 560 по 599 включительно;
в 16-ю группу – с № 600 по 639 включительно;
в 17-ю группу – с № 640 по 679 включительно;
в 18-ю группу – с № 680 по 719 включительно;
в 19-ю группу – с № 720 по 759 включительно;
в 20-ю группу – с № 760 по 799 включительно;
в 21-ю группу – с № 800 по 839 включительно;
в 22-ю группу – с № 840 по 879 включительно;
в 23-ю группу – с № 880 по 919 включительно;
в 24-ю группу – с № 920 по 959 включительно;
в 25-ю группу – с № 960 по 999 включительно.

11. Розыгрыш выигрышей производится только на первую тысячу счетов выигрышных вкладов. Если в учреждениях ОАО «АСБ Беларусбанк» число счетов по выигрышным вкладам более 1000, то выигравшими в последующих тысячах счетов считаются те же номера, что и в первой тысяче.

12. Для проведения тиража по выигрышным вкладам используются:

а) 3 тиражных барабана;
б) 135 тиражных патронов, в которые вкладываются тиражные билеты;
в) 135 тиражных билетов.

На билетах печатается:

на 100 билетах – числа «00», «01», «02», «03» и т.д. до «99» включительно, обозначающие сотни и десятки номеров счетов по выигрышным вкладам;

на 10 билетах – цифры с «0» до «9» включительно, обозначающие единицы номеров счетов по выигрышным вкладам.

На 25 билетах указываются размеры выигрышей по вкладам, а именно:

на 20 билетах – «Выигрыш в размере 112 % среднего остатка вклада за истекшее полугодие»;

на 2-х билетах – «Выигрыш в размере 225 % среднего остатка вклада за истекшее полугодие»;

на 2-х билетах – «Выигрыш в размере 450 % среднего остатка вклада за истекшее полугодие»;

на 1 билете – «Выигрыш в размере 900 % среднего остатка вклада за истекшее полугодие».

13. В первый барабан вкладывается 25 патронов с билетами, на которых обозначены размеры выигрышей; во второй барабан – 4 патрона с билетами первой группы, на которых напечатаны числа 00, 01, 02, 03, обозначающие сотни и десятки в номерах счетов; в третий барабан вкладываются 10 патронов с билетами, на которых напечатаны числа с № 0 по № 9 включительно, обозначающие единицы номеров счетов.

14. Розыгрыш выигрышей производится в следующем порядке.

Члены комиссии, находящиеся у тиражных барабанов, достают из каждого тиражного барабана по одному патрону и передают их членам комиссии. После объявления выигрыша, разыгранного по первой группе выигрышных вкладов, оставшиеся во втором барабане 3 патрона изымаются. Билет, изъятый из третьего барабана, вкладывается обратно в патрон и вновь помещается в третий барабан.

Изъятые при розыгрыше из первого барабана билеты, обозначающие размеры выигрышей, обратно в барабан не вкладываются.

Далее комиссия приступает к розыгрышу второй группы номеров счетов и т.д., пока не будут разыграны все 25 выигрышей.

15. Учет выигрышей и составление официальной таблицы.

15.1. В процессе тиража члены комиссии ведут учет выигравших номеров счетов и размеров выигрышей в двух экземплярах ведомостей и комплекте карточек.

15.2. После окончания тиража комиссия производит сверку записей выигравших номеров по ведомостям и карточкам.

15.3. Официальная таблица выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях, подписанная Председателем комиссии, его заместителем и членами комиссии, публикуется в средствах массовой информации (в течение 15 дней со дня определения результатов тиража).

В таблице указывается номер выигрышного счета и размер каждого выигрыша.

16. В период не позднее 15 дней после проведения тиража по каждому счету, на который выпал выигрыш, производится начисление процентов на сумму выигрыша (дополнительного дохода) с последующим причислением данной суммы к остатку вклада.

*Телефон для справок 88011005454 (звонок бесплатный).*

* * *

Приказом по ОАО «АСБ Беларусбанк» от 11.09.2008 № 457 для проведения 70-го тиража выигрышей, который состоится 09.10.2008 в г. Минске, утверждена тиражная комиссия в составе:

| | |
|---|---|
| Председатель комиссии: | Первый заместитель главы Администрации Октябрьского района г. Минска Станислав Филицианович Петкевич (с его согласия) |
| Заместитель председателя комиссии: | заместитель директора – начальник центра розничного бизнеса филиала № 527 ОАО «АСБ Беларусбанк» Елена Александровна Мацкевич |
| Члены комиссии: | 1. начальник управления нормативно-правовой работы юридического департамента ОАО «АСБ Беларусбанк» Галина Александровна Кужелева<br>2. начальник отдела по работе с физическими лицами центра розничного бизнеса филиала № 527 ОАО «АСБ Беларусбанк» Людмила Павловна Кульша<br>3. заведующий отделением № 527/199 ОАО «АСБ Беларусбанк» Наталья Максимовна Гусева<br>4. главная медсестра управления здравоохранения (3-я центральная районная клиническая поликлиника Октябрьского района г. Минска) Людмила Зигмундовна Кулаковская (с ее согласия)<br>5. инженер Республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Минскагротранс Татьяна Владимировна Кравцова (с ее согласия) |
| Ответственный секретарь: | заместитель директора департамента розничного бизнеса ОАО «АСБ Беларусбанк» Татьяна Александровна Ясинская |

*Свидетельство о регистрации № 1190 от 30 сентября 2008 года выдано Министерством торговли Республики Беларусь.*

**Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей.**

| | январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вклады до востребования | 20,3 | 62,4 | 149,7 | 238,4 | 148,6 | 193,3 | 202,6 | 233,2 | 244,1 | 365,5 | 397,0 | 29 577,5 | 31 832,6 |
| в том числе: в белорусских рублях | 19,4 | 59,3 | 146,3 | 234,1 | 142,4 | 187,7 | 196,5 | 222,2 | 237,7 | 355,5 | 388,0 | 29 408,3 | 31 597,5 |
| в иностранной валюте | 0,9 | 3,1 | 3,4 | 4,3 | 6,2 | 5,6 | 6,1 | 11,0 | 6,4 | 10,0 | 9,0 | 169,2 | 235,1 |
| Срочные депозиты | 30 358,5 | 32 352,4 | 24 405,4 | 38 746,0 | 48 555,5 | 31 125,0 | 54 036,6 | 38 911,9 | 30 223,7 | 55 111,0 | 42 713,9 | 52 150,6 | 478 690,4 |
| в том числе: в белорусских рублях | 26 895,8 | 28 068,5 | 20 038,5 | 29 455,9 | 42 531,2 | 25 248,9 | 42 908,6 | 32 018,1 | 23 385,1 | 42 826,4 | 34 573,9 | 35 011,8 | 382 962,8 |
| в иностранной валюте | 3 462,7 | 4 283,9 | 4 366,9 | 9 290,1 | 6 024,3 | 5 876,1 | 11 128,0 | 6 893,8 | 6 838,6 | 12 284,6 | 8 140,0 | 17 138,8 | 95 727,6 |

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

# ВАШ САЙТ МОЖА АКАЗАЦЦА Ў ЭЛЕКТРОННЫМ АРХІВЕ

У недалёкай будучыні даступным для беларусаў можа стаць віртуальны архіў князёў Радзівілаў, які аб'яднае ўсе дакументы з фонду Радзівілаў, што захоўваюцца ў архівах Літвы, Польшчы, Расіі і Беларусі. Дарэчы, у нашай краіне знаходзіцца толькі 32 працэнты дакументаў з фонду Радзівілаў. І вярнуць арыгіналы іншых дакументаў на Беларусь не ўяўляецца магчымым. Затое іх можна перавесці на электронныя носьбіты, што дазволіць стварыць так званы віртуальны архіў, які будзе даступны не толькі для беларускага даследчыка.

— Архіў Радзівілаў не можа быць уласнасцю нейкай адной краіны, таму стварэнне віртуальнага архіва стала сумесным праектам некалькіх краін, — паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі, прысвечанай прафесійнаму святу архівістаў, дырэктар Беларускага навукова-даследчага цэнтра электроннай дакументацыі Вячаслаў Насевіч. — Мы ўжо замовілі архіў Радзівілаў для ўнясення яго ў рэестр ЮНЕСКА «Памяць свету». У выпадку прыняцця станоўчага рашэння нам будзе значна прасцей знайсці грошы, каб прыступіць да сучаснага аблічбавання ўсіх архіўных дакументаў. А пакуль што мы працуем над стварэннем навукова-даследчага апарата. Да аблічбавання архіўных дакументаў яшчэ не прыступілі ні ў адной краіне, якія ўдзельнічаюць у праекце.

Дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Уладзімір Адамушка расказаў, што апошнім часам надаецца вялікая ўвага замежнай архіўнай беларусіцы.

— Мы паставілі перад сабой мэту выявіць усе дакументы, што знаходзяцца ў замежных архівах і тым ці іншым чынам тычацца гісторыі або культуры Беларусі, затым стварыць даведнікі і запусціць іх у навуковы абарот, — патлумачыў Уладзімір Адамушка. — Нашы архівісты цесна супрацоўнічаюць у гэтым напрамку з калегамі з Літвы, Латвіі, Польшчы і Украіны. Пры гэтым улічваюць, што нашы інтарэсы — узаемныя. З Украінай, напрыклад, ужо дасягнута дамоўленасць аб стварэнні сумеснага даведніка і зборніка дакументаў па партызанскім руху на Палессі. Цікавыя праекты намячаюцца паміж Нацыянальным гістарычным архівам і расійскім Ваенна-гістарычным архівам па асвятленні падзей Першай сусветнай вайны. Гэта тэма аказалася, на наш погляд, незаслужана забытая. Збіраемся гэты прабел ліквідаваць. З нашымі калегамі з Расіі нам працаваць значна прасцей, таму што па расійскіх архіўных фондах складзены выдатныя даведнікі. Трэба толькі іх прааналізаваць і стварыць на іх аснове даведнікі для беларускіх даследчыкаў.

Дарэчы, у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, дзе захоўваюцца дакументы пачынаючы з 1917 года і да нашага часу, 99 працэнтаў усёй дакументацыі адкрыта для даследчыкаў, і толькі каля 1 працэнта дакументаў пакуль знаходзяцца на сакрэтным захоўванні. Як запэўніваюць беларускія архівісты, закрытыя для агульнага доступу дакументы не з'яўляюцца вялікай тайны.

Усяго ў беларускіх архівах захоўваецца цяпер 12 мільёнаў дакументаў на папяровых носьбітах, з іх 300 тысяч — асабліва каштоўныя. У ведамасных архівах знаходзяцца яшчэ 6,5 мільёна адзінак дакументаў, якія чакаюць сваёй чаргі на дзяржаўнае захоўванне.

— Штогод мы прымаем на дзяржаўнае захоўванне 100 тысяч спраў. Усё, што да нас трапіла, будзе захоўвацца вечна, — дадаў Уладзімір Адамушка.

Адна з праблем, якая хвалюе архівістаў усіх краін свету, гэта пошук даўгавечных сродкаў захавання архіўных дакументаў. Увогуле, чым часцей выкарыстоўваецца той ці іншы дакумент, тым менш у яго шанцаў захавацца. 10 гадоў таму ў Беларусі быў створаны Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі. Аднак нават тут сумняваюцца ў неабходнасці пераводзіць на электронныя носьбіты ўсе архіўныя фонды.

— Спецыфіка работы архіваў заключаецца ў тым, што даследчыкамі ці грамадзянамі запатрабавана зусім невялікая колькасць дакументаў, — тлумачыць Уладзімір Насевіч. — Таму ў першую чаргу на электронныя носьбіты будуць пераводзіцца менавіта самыя запатрабаваныя ў наведвальнікаў архіваў дакументы. Мы плануем стварыць даведнікі і каталогі ўсіх архіваў у электронным выглядзе. Гэта, спадзяёмся, дазволіць калі-небудзь любому карыстальніку інтэрнэту знайсці лічбавыя копіі патрэбных ім дакументаў. Апошнім часам, як усе мы бачым, інтэрнэт-прастора пашыраецца вельмі імклівымі тэмпамі. Інфармацыя, якая змяшчаецца на многіх сайтах, таксама можа быць карыснай для гісторыі, напрыклад, інфармацыя па сістэме адукацыі. Цікава, напэўна, будзе паглядзець праз шмат гадоў, як выглядаў той ці іншы сайт. Таму, калі працоўшчыкі інтэрнэт-праекта зацікаўлены ў тым, каб захаваць яго для гісторыі, няхай звяртаюцца ў Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі, каб мы ўключылі яго ў электронны архіў. Персанальны сайт, заўважу, таксама можа быць цікавым для нашчадкаў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ідзі і глядзі

# ВЯЛІКІЯ ЛЯЛЬКІ І ІХ СПАДЗЯВАННІ

**Беларуская батлейка ля ўваходу ў глядзельную залу, вясёлыя лялькі, якія частуюць гасцей хлебам, дзеці і дарослыя, якія чакаюць самага галоўнага адкрыцця для сябе — адкрыцця мастацтва... Прыкметы Беларускага міжнароднага фестывалю тэатраў лялек, які пачаўся ўчора — пра гэта гучна пратрубілі музыкі ансамбля «Гуды» Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў, запрасіўшы ўсіх у залу, дзе пачаткам павінен быў стаць спектакль гаспадароў. Але прэм'еру «Балады пра белую вішню» прыйдзецца яшчэ пачакаць, а ў рамках фестывалю быў паказаны іншы спектакль мінскіх лялечнікаў. І дзіўныя гадзіннікі розных формаў ля сцэны пачалі адлік чароўных імгненняў самага незвычайнага фестывалю, у праграме якога спалучыліся прыгожыя спектаклі для дзяцей і сур'ёзныя пастаноўкі для дарослых, якія прыехалі з розных куткоў Еўропы. І ў нас ёсць толькі шэсць дзён на тое, каб паглядзець 21 пастаноўку з якіх 6 пакажуць беларускія тэатры.**

***Уладзімір РЫЛАТКА, першы намеснік міністра культуры Беларусі:***

— Гэта вялікае свята для нашага горада, якое нічым замяніць немагчыма. Амаль што дзесяць гадоў фестываль не праводзіўся, але прыкметна, што ён вяртаецца ў юбілейны год для Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек. Яму рады не толькі мы, але і нашы госці — да нас прыехалі лепшыя тэатры свету. Сёння можна сказаць: самаму лепшаму нашаму фестывалю — быць!

***Аляксандр КУЛЕШ, госць з Рускага інжынернага тэатра, Санкт-Пецярбург:***

— Я рады, што мы прыехалі ў Беларусь. У нас ёсць школа, якая рыхтуе лялечнікаў, і вы зможаце ацаніць яе вартасці. Фестываль — выдатная магчымасць паказаць сваё майстэрства. Але любы фестываль — гэта мір, дзе няма геаграфічных межаў, гэта асаблівая краіна, дзе пануе дабрыня.

***Яўген ЛЕМАКОЎ, дырэктар Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек:***

— Усе, хто займаецца тэатрам лялек, ведаюць, што значыць падрыхтаваць фестываль, што значыць сустрэць гасцей. Да нас прыехалі ўсе, каго мы чакалі. Квіткоў на спектаклі ўжо няма і ў гэтым ёсць вялікая радасць. Кіраўніцтва горада прыклала намаганні, каб фестываль адбыўся. Жадаю прыемных уражанняў гледачам ад спектакляў, а гасцям ад нашага горада.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка г. Полацка Вікторыя ШАКАЛЬ і яе маленькія сябры.

# ЧАЛАВЕК САБАКУ СЯБАР

І не толькі сабаку. Ва ўсякім разе, штогод 4 кастрычніка чалавецтва прыгадвае аб сваёй ролі ў абароне фаўны і аб адказнасці перад братамі меншымі, адзначаючы Сусветны дзень жывёл.

Афіцыйна заснаваны ён быў у 1931 годзе на Міжнародным кангрэсе прыхільнікаў руху ў абарону прыроды, што праходзіў у Фларэнцыі. Тады аб'яднанні з розных краін свету ўзялі на сябе абавязак кожны год арганізоўваць разнастайныя масавыя мерапрыемствы. У Расіі ж, напрыклад, дата адзначаецца толькі з 2000 года ў адпаведнасці з рашэннем Міжнароднага фонду абароны жывёл. І гэта пры тым, што наша ўсходняя суседка займае другое месца ў свеце пасля ЗША па колькасці хатніх жывёл — у кожнай трэцяй сям'і жывуць махнатыя, гладкашэрсныя, крылатыя, халаднакроўныя і іншыя хатнія любімцы.

Дарэчы, дата «зверскага» дня выбрана не выпадкова. Больш як 800 гадоў таму (прыкладна ў 1182 годзе) 4 кастрычніка нарадзіўся святы Францыск Асізскі, заснавальнік ордэна францысканцаў, які таксама лічыцца святым абаронцам жывёл ад чалавечай жорсткасці. У каталіцкіх краінах у храмах ладзяцца ўрачыстыя месы, прычым, напрыклад, у Іспаніі на іх абавязкова прыводзяць для блаславення і сваіх хатніх гадаванцаў.

## Святыя апекуны...

У праваслаўнай традыцыі таксама існуе нямала святых — апекуноў жывёл. Практычна ў кожнага віду сельскагаспадарчых жывёл існуе свой нябесны апякун. Так, святы Уласій (11 лютага) дапамагае ўсім жывёлаводам, святыя Флор і Лаўр — каняводам, святы Васіль — свінаводам, святы Мікіта — тым, хто гадуе вадаплаўную птушку, святая Агаф'я-пакутніца спрыяе ацёлу кароў, а Анісім-аўчарнік зберагаў ад ваўкоў авечак у аўчарнях. Апекуном хатніх жывёл лічыцца святы Мадэст Іерусалімскі (31 снежня), а пра лячэнне і дабрабыт братоў меншых клапоціцца пакутніца Настасся Рымляніна.

Увогуле, у народнай свядомасці трывала замацавалася: той, хто не любіць жывёл, наўрад ці можа шчыра любіць людзей. А ў многіх заходнееўрапейскіх краінах лічыцца, што хатняя жывёла — паўнапраўны член сям'і, з такімі ж правамі, як і ў людзей.

## ...і святыя жывёліны

Тое, што ў Індыі карова лічыцца жывёлінай святой і недатыкальнай, вядома нават вучням малодшых класаў. А вось да чаго даводзіць такое пакланенне, ведаюць далёка не ўсе. У Бамбеі, напрыклад, для таго каб прагнаць кароў з узлётнай паласы аэрадрома, выкарыстоўваюць стужку з запісам рыку тыгра — бо крануць карову не вырашыцца ніводны індыец.

У Японіі свяшчэннымі лічацца каты — у горадзе Кагасіма ёсць нават Храм кошак, пабудаваны некалькі стагоддзяў таму.

У Старажытным Егіпце свяшчэннымі былі ледзьве не ўсе навакольныя жывёлы. Многіх шанують і дагэтуль. У некаторых месцах захаваліся могілкі свяшчэнных кракадзілаў, бараноў і ібісаў.

Славяне таксама шанавалі некаторых дзікіх жывёл, лічачы іх сваімі продкамі. Напрыклад, у якасці татэмаў вядомыя рысь, сокал, белы воўк.

Каб лічыцца свяшчэннай, жывёле нават не абавязкова існаваць у рэальнасці. Так, у Старажытным Кітаі свяшчэннымі былі тыгр, чарапаха, дракон і фенікс. А ў цалкам сабе сучасных ЗША можа быць «асвячоны»... мультыплікацыйны герой, кот Гарфілд! Яго пажадалі зрабіць сваім талісманам амерыканскія лётчыкі — і нават адправілі адпаведнае прашэнне па інстанцыях. У заяўцы, у прыватнасці, адзначана, што Гарфілд «як ніхто іншы адлюстроўвае дух незалежнасці, а таксама з'яўляецца ўзорам умення ўзяць сябе ў рукі ў складаных сітуацыях».

Натуральна, маліцца на сваіх хатніх любімцаў, а тым больш кананізаваць іх мы нікому не раім. Але папесціць сябра, не забыцца зрабіць яму прышчэпку, падрыхтаваць пачастунак, нават проста бавіць з ім больш часу, чым звычайна — чаму б не? Тым больш, што ўдзячнасць з яго боку не прымусіць сябе чакаць.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

**P.S.** *З 4 кастрычніка ў 15 краінах свету пачынаецца таксама Міжнародны тыдзень у абарону жывёл.*

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

## на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства

| Наименование предмета аукциона | Право заключения договора аренды земельного участка для строительства базы отдыха на 18 мест | Право заключения договора аренды земельного участка для строительства площадки отдыха | Право заключения договора аренды земельного участка для создания туристско-этнографического центра | Право заключения договора аренды земельного участка под строительство охотничье-рыболовных домиков на 18 мест |
|---|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендодатель земельного участка | Малоритский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Малорита, ул. Красноармейская, д. 1 Тел. 8(01651) 2 30 17 | Пружанский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Пружаны, ул. Г. Ширмы, д. 17 Тел. 8(01632) 7 10 93 | Пинский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Пинск, ул. Днепровской флотилии, д. 21 Тел. 35 38 81 | Ивановский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Иваново, пл. Октября, д. 2 Тел. 8(01652) 2 13 69 |
| Адрес земельного участка/ Кадастровый номер земельного участка | Брестская область, Малоритский район, 0,3 км северо-восточнее д. Луково на озере Луковское/ № 125200000001000445 | Брестская область, Пружанский район, на 7 км справа автомобильной дороги Р-101 Пружаны–Береза/ № 125600000001000452 | Брестская область, Пинский район, Городищенский с/с, 1,1 км юго-западнее дер. Кривичи/ № 125482500001000043 | Брестская область, Ивановский район, Мотольский с/с, 5,2 км северо-западнее дер. Мотоль (восточный берег водохранилища «Жидинье»)/ № 123084505601001120 |
| Размер (площадь) земельного участка, га | 0,9600 | 0,1298 | 0,9993 | 0,6240 |
| Срок аренды земельного участка, лет | 50 | 20 | 50 | 50 |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства базы отдыха на 18 мест на озере Луковском | для строительства площадки отдыха | для создания туристско-этнографического центра юго-западнее дер. Кривичи, (паркинг, сувенирный киоск) | под строительство охотничье-рыболовных домиков на 18 мест |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Территория участка на 0,29 га покрыта лесом, 0,40 га – пески, 0,27 га – древесно-кустарниковая растительность. Участок расположен в водоохраной зоне и прибрежной полосе оз. Луковского и имеет ограничения в использовании земель: в водоохраной зоне на площади 0,61 га, прибрежной полосе на 0,35 га, санитарно-защитной полосе водоотвода на площади 0,10 га соответственно. Подъезд к участку с автодороги Луково-Заболотье (участок находится в придорожной полосе автодороги Н-745 Луково (от а/д М-12) – Новое Заболотье (4 категория). | Участок покрыт лесом. Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи на площади 0,026 га. | Участок свободен от строений и сооружений и мелиоративных каналов. Подъезд к участку предусматривается по существующей дорожной сети. Установлены ограничения в использовании земельного участка на всей площади в водоохраной зоне и прибрежной полосе реки Припять. | Участок пустует, посадка леса не производилась, граница земельного участка проходит по суходолу. Подъезд к участку будет осуществляться по существующей дорожной сети СПК «Агро-Мотоль». Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохраной зоне водохранилища «Жидинье» на площади 0,6240 га*. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 12 502 230 | 4 106 580 | 89 172 980 | 40 124 900 |
| Размер задатка, руб. | 1 250 220 | 410 660 | 8 917 300 | 4 012 490 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | - внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона: расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношения создания земельного участка; - заключения победителем аукциона с Малоритским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. Победителю аукциона строительство необходимо осуществлять на условиях: - строительство базы выполнить на расстоянии не менее 50,0 м от бровки земляного полотна автодороги до линии застройки; - съезд к застройке выполнить согласно ТКП 45-3. 03-19-2006 (02250) «Автомобильные дороги» раздел 6 с устройством покрытия согласно п. 6.1.14. (как для главной дороги 4 тех. категории); - при необходимости снабжения базы отдыха электричеством и связью строительство воздушной линии электроснабжения выполнить согласно ТКП 45-3.03-19-2006 «Автомобильные дороги» п. 6.4., при переходе автодороги учесть дополнительную высоту насыпи 0,5 м и прокладку кабеля связи вдоль дорог производить за пределами полосы отвода на расстоянии не менее 14,0 м от оси а/д 4 категории; в населенных пунктах не менее 1.0 м от наружной бровки кювета, подошвы насыпи дороги или, в случае, когда отсутствует земляное полотно, тротуары – не менее 1,5 м от бортового камня улицы, дороги (укрепленные полосы обочины, кромки проезжай части) (согласно таб. 9.1 СНБ 3.03.02-97 «Улицы и дороги городов, поселков и сельских населенных пунктов»), переходы через а/д выполнять закрытым способом с устройством защитного футляра на глубину не менее 1,4 м от верха покрытия проезжей части до верхней образующей футляра; - проект в обязательном порядке согласовать с ДРСУ № 179; - места производства работ оградить дорожными знаками и схему их расстановки согласовать с ГАИ Малоритского РОВД; - за три дня до начала работ письменно известить ДРСУ № 179 (г. Малорита, ул. Советская, д. 134, тел./ф. 2 02 71, 2 36 02) о дате начала и окончания работ; - после окончания работ в течение 1-го дня привести в порядок придорожную полосу и сдать по акту ДРСУ № 179. | - право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализацией древесины, получаемой от вырубки, ГЛУ «Пружанский лесхоз» в установленном порядке; - внесение победителем аукциона платы за право заключение договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; - заключения победителем аукциона с Пружанским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проектной документации на строительство объекта в срок не превышающий 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документации. | - право вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализации древесины, получаемой от вырубки, в установленном порядке; - внесение победителем аукциона платы за право заключение договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка. - заключение победителем аукциона с арендодателем договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения арендодателем о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительства объекта в срок, не превышающий 2-х лет; - осуществления строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. | - внесения победителем аукциона платы за право заключение договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; - заключения победителем аукциона с Ивановским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения Ивановского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел.: (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85. www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by* | | | |

**(Положение о порядке установления размеров и границ водоохранных зон и прибрежных полос водных объектов и режиме ведения в них хозяйственной деятельности, утв. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21 марта 2006 г. № 377)*

Повторный аукцион состоится **31 октября 2008 года** в 11.10 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в повторном аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в повторном аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в повторном аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельных участков на местности осуществляет арендодатель.

Победитель повторного аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Повторный аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

**Участник, ставший победителем повторного аукциона, после проведения повторного аукциона обязан:** подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения повторного аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

***Заявления на участие в повторном аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 6 октября 2008 года по 27 октября 2008 года включительно.***

# Не дайце прастудзе шанцу

Восенню з яе няспыннымі дажджамі і пранізлівым ветрам магчымасць падхапіць прастуду павялічваецца ў разы. Варта толькі прамачыць ногі або апрануць лёгенькае паліто — як ужо вечарам горла пяршыць, тэмпература павысілася, нос залажыла... Таму, каб не дапусціць захворвання, калі вы моцна празяблі, — прыміце экстранныя меры, скарыстаўшы народныя, правераныя часам сродкі.

● Па-першае, прыйшоўшы дадому, адразу пераапраніцеся ў сухое і цёплае адзенне. Заварыце сабе сагравальны чай: 2 ст. лыжкі кветак бузіны і 3 ст. лыжкі ліпавага цвету заліце шклянкай кіпеню. (У кубак можна дадаць крыху вермуту, каньяку, сок лімона.)

● Прыгатуйце салату з прадуктаў, якія змяшчаюць шмат вітаміну С: свежай капусты, балгарскага перцу, мандарынаў, апельсінаў, лімонаў, ківі.

● Нашы бабулі ведалі спакон веку: пры прастудзе палягчае стан курыны булён. Ён змяшчае інгрэдыенты, якія ўплываюць на імунную сістэму, і процізапаленчыя рэчывы, якія супакойваюць боль у горле і паляпшаюць самаадчуванне. Для супу вазьміце курынае мяса, цыбулю, бульбу, пастарнак, сельдэрэй, пятрушку (прычым лепш яго не саліць).

● Змагацца з першымі сімптомамі прастуды добра дапамагае лекавы напой на аснове піва. Для яго прыгатавання вазьміце дзве бутэлькі свежага піва і крыху карыцы, дадайце 3—4 палачкі гваздзікі і крыху лімоннай лупіны. Далей трэба расцерці тры жаўткі з 4 ст. лыжкамі цукру да з'яўлення пены. Памешваючы, уліць у гэту пену гарачае піва з прыправамі. Пасля паставіць сумесь на агонь і варыць, пакуль не загусцее, аднак не кіпяціць. Прымаць напой трэба перад сном па 0,5—1 шклянцы.

Маленькім дзецям у якасці ўмацавальнага сродку рэкамендуецца піць адвар інжыру ў малацэ.

І яшчэ адзін рэцэпт для дарослых: 1 ст. лыжка гарэлкі або каньяку + 1 ст. лыжка малінавага варэння + 1 ст. лыжка мёду + сок палавіны лімона. Усё заліць кіпенем, размяшаць і маленькімі глыткамі прыняць перад сном.

● Каб не заклала нос, звярніцеся да правераных памочнікаў — алоэ і каланхоэ. Гэтыя расліны валодаюць процізапаленчымі і бактэрыцыднымі ўласцівасцямі. Закапайце іх сок па 2—3 кроплі ў кожную ноздру.

● Калі вашы ногі прамоклі, пратрыце іх гарэлкай і адзеньце шарсцяныя шкарпэткі. Альбо — ужо накіроўваючыся ў ложак — натрыце пяткі бальзамам «Зорачка».

● Спыніць прастуду дапаможа гарачая нажная ванна з парашком гарчыцы. Пасля працэдуры абавязкова адзеньце цёплыя шкарпэткі.

● Каб не расхварэцца, карысна будзе папарыць рукі. Усё, што трэба для гэтага, — кран з гарачай вадой і каля 15 хвілін вольнага часу. Падстаўце рукі па локаць пад струмень. Пачатковая тэмпература вады — прыемна цёплая, а затым рабіце яе больш гарачай. Абавязкова добра вытрыце рукі і пастарайцеся цяплей апрануцца (лепш за ўсё падыдзе шарсцяны світар з доўгімі рукавамі).

● Зменшыць верагоднасць з'яўлення прастуды можна, калі некалькі разоў на дзень паласкаць рот і горла, а таксама прамываць нос моцна салёнай вадой.

● Калі часта бываеце ў лесе, карысна для прафілактыкі прастуды і ангіны жаваць іголкі і смалу хвойных дрэў.

● Для папярэджання прастудных захворванняў добра правесці два-тры курсы лячэння раслiннымі адаптагенамі — жэньшэнем або элеўтэракокам.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Бяседныя песні

# Пасылала баба дзеда

Часта народныя песні «У месяцы верасні» і «Пасылала баба дзеда» спяваюцца на бяседзе адна за адной. Яны блізкія між сабою тэматычна — паказваюць вынікі праяў характару і волі жанчыны. Калі ў першай песні адразу гаворыцца пра жаночую ліхасць («і крычыць, і бурчыць, проці дзеда не змаўчыць»), то ў другой гэта выяўляецца праз пагрозу адмовіць у каханні («далібог, пакіну»).

І, як усе фальклорныя творы, абедзве песні надзвычай павучальныя: даюць жыццёвы ўрок і для кабет, і асабліва для мужчын. У іх створаны класічны вобраз жанчыны (якой заўсёды па добраму мала), з якім цалкам суадносіцца вобраз старой з пушкінскай «Казкі пра рыбака і рыбку».

Ні Ганна Карэніна, ні мадам Бавары з іх прагаю ўзаемнасці, ні апантаная ў дасягненні сваіх мэтаў Скарлет не ўвасабляюць так жаночую сутнасць, як гэта падаецца ў народных песнях і казках. Тут усё сцісла, наглядна і пераканальна. Таму на бяседзе, дзе ад весялосці ўзнікае шмат шуму, дробязных перамоў і выказванняў, песня становіцца ўважлівым дарадчыкам і мудрым выхавальнікам. Яна ўпарадкоўвае застолле, духоўна яднае бяседнікаў, спрыяе выказаць тое, што тычыцца ўсіх прысутных. І робіць гэта напеўна, спакойна, нават з любасцю.

**Беларуская народная песня**

*Пасылала баба дзеда*
*У луг па каліну:*
*— Не наломіш калінанькі,*
*Далібог, пакіну.*
*Пайшоў дзед праз ваду*
*У луг па каліну:*
*Ужо дзеду вадзічанька*
*Залівае спіну.*
*А ўжо дзеду вадзічанька*
*Па пояс займае, —*
*Сядзіць баба на беражку,*
*Далей пасылае:*
*Ідзі, дзед, ідзі, дзед,*
*У луг па каліну, —*
*Не наломіш чырвонае,*
*Далібог, пакіну.*
*Ужо дзеда вадзічанька*
*Па шыю займае, —*
*Сядзіць баба на беражку,*
*Далей пасылае:*
*— Ідзі, дзед, ідзі, дзед,*
*У луг па каліну, —*
*Не наломіш чырвонае,*
*Далібог, пакіну.*
*Ужо дзеду вадзічанька*
*У самы рот ліецца, —*
*Сядзіць баба на беражку*
*І з дзеда смяецца,*
*Хі-хі-хі, ха-ха-ха,*
*Баба ўсё смяецца,*
*Бо вада, бо вада*
*Дзеду ў рот ліецца.*
*— Дзякуй богу, дзякуй мне,*
*Што няма старога.*
*Заўтра пайду на рыначак,*
*Куплю маладога.*
*Ля-ля-ля, ля-ля-ля,*
*Ўжо няма старога,*
*Заўтра пайду на рыначак,*
*Куплю маладога.*
*Маладога на рыначку*
*Баба не купіла, —*
*Прыйшла-села на беражку*
*Ды загаласіла:*
*— Устань, дзед, устань, дзед,*
*З цёмнае магілы.*
*Ой, дурная галава, —*
*Што ж я нарабіла.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

